№ 3 (361) 23 студзеня 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Пакуль Ленін у маўзалеі, ён жывы

Гутарка з Аляксандрам Якаўлевым.

старонка 2

Мова-2004

Тычку ў лычку, лямпачку ў дамок.

старонка 10

Як зарабіць

на плягіяце.

старонка 6

РЭКЛЯМА

Sion COMPUTERS

Шаноўнае Спадарства!

Прапануем Вам па самых нізкіх коштах пастаўкі і будоўля камплектавальных.

У нашых Менскай бібліяцэцы [illegible] бясплатныя кансультацыі

239-31-80 770 70 84 265-00-85

Газу, газу!

«Газпром» і «Белтрансгаз» зноў не дамовіліся ні аб продажы беларускіх газаправодаў, ні аб пастаўках газу ў Беларусь у 2004 г. Апошнія перамовы кіраўнікоў «Газпрому» Аляксея Мілера і «Белтрансгазу» Пятра Пётуха не далі плёну. Эканамічная хроніка — **старонка 6.**

Сьвіслач ізноў спусьцілі

Да пачатку вясны будуць чысьціць рэчышча Сьвіслачы ў сталіцы ад парку Горкага да вул.Кастрычніцкай. У спэцыяльны фонд ачысткі ракі, куды ўсе юрыдычныя асобы Менску мусяць адлічыць па 300 тыс., плянуецца сёлета сабраць 1,6 млрд руб. Пачысьціць усю Сьвіслач, з Чыжоўскім вадасховішчам улучна, зьбіраюцца да 2007 г. Донныя адклады вывозяцца ў гідраізаляваны кар'ер за аўтарынкам, што ў Малінаўцы.

Цётка ахвяравала 1,5 мільярда

Паўтара мільярда даляраў адпісала амэрыканка Джаан Б. Крок Арміі Выратаваньня, што апякуецца беспрытульнымі ды алькаголікамі. Кабета была ўдавою заснавальніка сеткі кафэ хуткага харчаваньня «Макдональдз». Яна памерла ў кастрычніку, цяпер агучаны яе запавет. Болей за Крок ахвяравалі на дабрачыннасьць толькі Біл і Мэлінда Гейтсы — 5 млрд даляраў у акцыях «Майкрасофту».

Душа баліць за праізвоства

Душа баліць за праізвоства, а ногі цягнуцца дамоў. Гумар — **старонка 16.**



Пяць крокаў да лепшага жыцьця

Старонка 5.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Хто падвядзе «тлустую рысу»

Ці павінны ўлада і апазыцыя дзеля прагрэсу краіны пайсьці насустрач адна адной, падвёўшы «тлустую рысу» пад 90-мі гадамі? Ці справядлівы прынцып «Чым далей ад Расеі — тым лепей для беларускай дзяржаўнасьці»? Гэтыя праблемы сталі тэмамі палемікі паміж «Нашай Нівай» і «Народнай воляй».

Дыскусію выклікалі камэнтары «НН» да вынікаў думскіх выбараў у Расеі. Палітычнае стабільнасьці ў краіне ня будзе, пісала «НН», «пакуль улады і апазыцыя не пачнуць гуляць у адным стылі і на адным полі». Неабходнымі ўмовамі гэтага газэта называла дзьве — «тлустую рысу» пад мінулым, пад 90-мі гадамі, і адмову ад гвалту як спосабу дасягненьня палітычных мэтаў. Гэтыя развагі выклікалі рэзкую рэакцыю Сямёна Букчына: «У разбэшчанай крытыцы «імпэрскага суседа» ў афіцыёзным друку дзеячы «НН» бачаць падмурак будаўніцтва сувэрэннай беларускай дзяржавы. Лёгіка простая: чым далей ад Расеі, тым бліжэй да незалежнай Беларусі». Асаблівае абурэньне ў Сямёна Букчына выклікае прапанова наконт «тлустае рысы»: «Ухваліць злом Канстытуцыі? Зьбіцьцё дэпутатаў Вярхоўнага Савету? Выкраданьне лідэраў апазыцыі? Зьнішчэньне прадпрымальніцтва і незалежнага друку?» — задае рытарычныя пытаньні публіцыст. Галоўны рэдактар «НН» Андрэй Дынько, публіцыст «НВ» Сямён Букчын і аглядальнік Юры Дракахруст працягнулі сваю дыскусію за «круглым сталом» радыё «Свабода». **Старонка 11.**

Ціхі старт «Пяцёркі+»

Апазыцыя аб'ядналася ў адзіную перадвыбарную кааліцыю. Гэтага сыгналу чакалі на Захадзе і Ўсходзе.

Беларуская апазыцыя прэзэнтавала «Пяцёрку+» ціха, прадказальна і без аншлягу. Усё было знаёма. Міжнародны адукацыйны цэнтар. Правераныя ў баях за дэмакратыю палітыкі. Мінімум новых твараў. Мінімум ідэалёгіі. Грамадзтва столькі нагледзелася ўжо гэтых рухаў, што ставіцца да любых такіх пачынаньняў абачліва. Цяжка сказаць, колькі шанцаў мае старая схема — кааліцыя традыцыйнай апазыцыі з апорай на Захад. Але вялікага выбару няма. «Пяцёрка+» падкупае прынамсі сваёй беларускамоўнасьцю.

Прымаюць «Пяцёрку» ў Варшаве, дэпутатаў «Рэспублікі» — у Празе. Да іх прыглядаюцца, ім робяць знакі ўвагі. Але ключ да перамогі — усё ж у базе ўнутры краіны. Пакуль гэтая база ня выявілася. Вось у чым загваздка.

На руціннай прэзэнтацыі «Пяцёркі+» заўважны быў Васіль Старавойтаў. Прыкметны менавіта сваёй урачыстасьцю, сваімі ордэнамі і зоркамі, якія ён надзеў дзеля веры ў палітыкаў. Усеагульныя спадзяваньні выказаў сьпявак Лявон Вольскі: «Я спадзяюся на выхад краіны з застою. Гэты выхад мусіць нарэшце адбыцца. Таму што краіна ў цяжкім пэрыядзе застою ўжо некалькі гадоў. Гэта трэба ламаць, і я спадзяюся на любую сілу, якая гэта зламае».

Хацелася б спадзявацца.

Дэталі, дакумэнты, тэхналёгіі «5+» — старонкі 3—5.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Стракацень культуры

Выстава Алеся Шатэрніка ў Музэі сучаснага мастацтва, прэм'ера фільму Бэрталючы, успамін пра Чэслава Немэна, сустрэча з Арловым, музыка Радзівіла і Ельскага ў Заслаўі, крывіцкае ткацтва, раскладзенае на піксэлі, год беларускай культуры ў Расеі, рэстаўрацыя Домскага сабору… **Старонкі 12—13.**

«ARCHE» 5 гадоў

Часопісу «ARCHE», безь якога цяпер не ўявіць інтэлектуальнага жыцьця нашай маленькай Эўропы на ўсход ад Эўропы, споўнілася пяць гадоў. **Старонка 13.**

Нумар пра «NRM»

Рок-гурту «NRM» спаўняецца дзесяць гадоў. Нацыя (не насельніцтва) ужо звыкла прачынаецца пад «Одзірыдзідзіну» і кладзецца спаць пад «Сьпі спакойна, дарагі таварыш...» Гісторыя, дыскаграфія, гастраномія, парнаграфія, гаспадарка, культура і палітыка Незалежнай Рэспублікі Мроі — у «НН» **6 лютага.**

Заробкі вырастуць. За кошт чаго?

Урад плянуе падвысіць заробкі ў бюджэтнай сфэры да 175, а ў рэальным сэктары — да 195 даляраў да канца 2004 г. Для параўнаньня: летась сярэдні заробак не дасягнуў і 120 даляраў. Рэальныя заробкі расьлі далёка ня так хутка, як ВУП, экспарт і імпарт ды інш. А наперадзе, у 2005-м, — справаздача перад народам за абяцаньня да таго часу 250 USD кожнаму працоўнаму.

Вось і пачалі ўлады варушыцца. Ужо 12 студзеня тарыфная стаўка першага разраду была павялічаная да 35 тыс. руб. Плян падвышэньня заробкаў будзе даведзены кожнай вобласьці ў выглядзе дакладнага графіку (!). Дырэктар кожнага прадпрыемства будзе несьці адказнасьць за выкананьне паказчыкаў пляну. Калі дагэтуль прадпрыемствы здавалі справаздачы мясцовым уладам у выкананьні пляну выпуску прадукцыі/паслугі, дык цяпер яны мусяць рабіць тое самае і адносна пляну павелічэньня заробкаў.

Беларускую эканоміку нельга назваць эфэктыўнай. У краіну не ідуць інвэстыцыі, новыя тэхналёгіі. Не рэфармуюцца састарэлыя прадпрыемствы, не скарачаецца неэфэктыўная занятасьць. Не разьвіваецца прадпрымальніцкі сэктар. У такіх умовах казаць пра падвышэньне прадукцыйнасьці працы і, адпаведна, павелічэньне заробкаў папросту немагчыма. На што ж спадзяюцца ўлады, калі робяць такія прагнозы?

Па-першае, «падвысіць» рэальны заробак можна з дапамогай разнастайных статыстычных маніпуляцый. Мо яшчэ раз будзе зьмененая мэтодыка разьліку заробку. Альбо кіраўніцтва заводаў зоймецца элемэнтарнымі прыпіскамі.

Па-другое, будзе адбывацца далейшая ліквідацыя перакрыжаванага субсыдываньня паслугаў ЖКГ. Бюджэт папоўніцца новымі паступленьнямі ад грамадзянаў і здолее плаціць большыя заробкі. Але ж і яны будуць плаціць болей за жытло.

Па-трэцяе, улада спадзяецца на далейшае падзеньне курсу даляра. У 2003 г. індэкс росту спажывецкіх цэнаў у краіне ў два разы перавысіў рост курсу даляра. Паводле ацэнак экспэртаў, за апошнія гады пакупніцкая здольнасьць даляра зьменшылася недзе на 40%. Але на гэты фактар беларускі ўрад уплыву ня мае. Амэрыканская эканоміка, якая цяпер добра разьвіваецца і мае выдатныя пэрспэктывы, можа лёгка парушыць пляны ўладаў нашай краіны.

І найважнейшае: такое падвышэньне заробкаў прывядзе да перанапружаньня ў рэальным і фінансавым сэктарах эканомікі, бо яно будзе штучным, не абумоўленым адпаведным падвышэньнем прадукцыйнасьці працы. Гэта можа выклікаць інфляцыю і хранічную нявыплату альбо нясвоечасовую выплату заробкаў. Зусім як у жахлівых казках пра Расею, што паказваюць па тэлевізіі.

Дамінік Міхайловіч

Пакуль Ленін у маўзалеі, ён жывы

«Дэмакратыя выключае простыя дарогі. Усе гэтыя размовы, дыскусіі — дурасьць. Навошта тлуміць сабе гэтым галаву? Прэзыдэнт рашыў — і ўсё. Гэта і ёсьць спадчына Леніна і бальшавікоў», — кажа Аляксандар Якаўлеў, былы сакратар ЦК КПСС, архітэктар перабудовы. Напярэдадні 80-годзьдзя з дня сьмерці Леніна зь ім гутарыць карэспандэнт «Gazety Wyborczej».

— Ці адышоў Ленін у забыцьцё, якое напэўна заслужыў? А можа, ён дагэтуль вечна жывы?

— Ну што ж, ён сапраўды сьціраецца з памяці, мы ня памятаем таго, што ён зрабіў. На жаль. Мы перажываем амнэзію — не ў мэдычным сэнсе, а ў маральным. І гістарычным. Можа, таму, што падзеі адбываюцца занадта хутка. Мы нясёмся галопам, імкнёмся абагнаць самі сябе, а гэта адбіваецца на маральных прынцыпах. Нясьпынная гонка, нібыта чалавек сьпяшаецца дажыць да канца апошнюю хвіліну, дапіць апошні кілішак. І мы не заўважаем людзей, якія побач з намі таксама некуды сьпяшаюцца, не знаходзім для іх часу, яны нам нават перашкаджаюць. Мы жывём у шалёную эпоху. Дзе ж тут знайсьці час на ўспаміны?

— Можа, гэта інстынкт самазахаваньня? На страшныя і паскудныя рэчы лепей забыцца?

— Мы маем тут дачыненьне з цэлым комплексам праблем. Сярод іншага, гаворка ідзе пра непасрэдны, асабісты інтэрас людзей. Бо Ленін так сканструяваў, сфармаваў грамадзтва, што калі нехта хацеў зрабіць кар'еру — кар'еру вельмі спэцыфічную, — ён мусіў зрабіцца нягоднікам. Адкінуць прэч сумленьне, замяніць яго сумленьнем калектыўным. Бо менавіта яно служыла прапагандзе, ідэалёгіі — гаворка ішла пра тое, каб чалавек перастаў быць асабіста зацікаўленым у сваёй уласнай памяці і ўласным жыцьці. Каб ён зрабіўся машынай. Ленін — гэта злачынец, якіх у XX ст. было сапраўды няшмат; іх можна палічыць на пальцах адной рукі. Зь ім параўнаюцца толькі Гітлер, Сталін, Пол Пот — цяжка знайсьці некага яшчэ, каго можна было б абвінаваціць у генацыдзе. Мне ўвесь час не дае спакою пытаньне — чаму я як грамадзянін Расеі ніколі не зьвяртаўся ў суд, скажам у Страсбурскі, каб той асудзіў злачынствы супраць чалавецтва, зьдзейсьненыя Леніным і Сталіным? Не, нікому нічога падобнага нават у галаву не прыйшло. Затое прыходзіць у галаву штосьці зусім іншае — адзначыць некага за заслугі менавіта ордэнам Леніна. І павысіць яму за гэта пэнсію. Сьмешна? Сьмешна. Прыкра на душы? Прыкра. Але такі ўзровень нашай сьвядомасьці, па-ранейшаму калектывізаванай. Нам, як і раней, не ўдаецца выбрацца з гэтага віру.

І апрача інтарэсаў, скажам так, матэрыяльных, гэта, вядома ж, вынік шматгадовай прамыўкі мазгоў і ачмурэньня: на працягу 70 год людзям бесьперастанку ўбівалі ў галовы адно і тое.

Працяг на старонцы 14.

ШТО Ў СЬВЕЦЕ

Новы рэдактар «Нівы»

З Новага году ў легендарнага тыднёвіку беларусаў у Польшчы «Ніва» зьмянілася кіраўніцтва: старшынём праграмнай рады і галоўным рэдактарам газэты стаў Яўген Вапа. Сёньня «Ніва» разыходзіцца накладам 2500 паасобнікаў, 500 экзэмпляраў зь іх ідзе ў Беларусь.

Супраць Пуціна

«Камітэт 2008 — свабодны выбар» паўстаў у Расеі. Яго задача — не дапусьціць, каб праз чатыры гады Пуцін застаўся пры ўладзе ў Расеі. Кіраўніком камітэту стаў чэмпіён сьвету ў шахматах Гары Каспараў. У Камітэт увайшлі Барыс Нямцоў, публіцыстка Юлія Латыніна, сатырык Віктар Шандаровіч, журналіст Яўген Кісялёў. Агітаваць супраць Пуціна перад выбарамі 14 сакавіка лічыцца бессэнсоўным, бо прэзыдэнта падтрымлівае 81% жыхароў Расеі, а зь дзевяці супернікаў некаторыя самі выступаюць за Пуціна.

Шасьцёра блізьнятаў

Спадарыня Ван Гаўтэн, настаўніца з ЗША, нарадзіла адразу чатырох хлопчыкаў і дзьвюх дзяўчынак. Роды цягнуліся зь серады да суботы. Дзеці нарадзіліся заўчасна, за тры месяцы. Усе яны ў крытычным стане. Бяда: калі нараджаецца больш за пяць блізьнюкоў, мала хто зь іх жыве больш за год.

БТ

НАВІНКІ

Студзеньскія тэзысы

Для шараговага пралетарыя перадвыбарчая кампанія — шанец прынесьці ў сям'ю чупа-чупс.

Не падзяляю трывогі некаторых аналітыкаў наконт пэрманэнтнай аўтарэпрадукцыі дэмакратычных блёкаў-кааліцый. Для шараговага пралетарыя перадвыбарчая кампанія — шанец падзарабіць, каб прынесьці ў сям'ю чупа-чупс. Чым болей кандыдатаў, тым большы попыт на яго паслугі.

Для рынку электаральных паслуг на выбарах 2004 г. будуць уласьцівыя наступныя тэндэнцыі. Па-першае, Паша Севярынец падбівае моладзь, якая звычайна падносіла дарослым транспаранты, самой ісьці на выбары. Яго пароль «Кожны расклейшчык сьцікераў можа быць дэпутатам» здольны абудзіць амбіцыі часткі мэнэджэраў сярэдняга зьвяна і выклікаць турбуляцыі ў гэтым сэктары працоўнага рынку.

Па-другое, ёсьць небясьпека, што большасьць палітыкаў будзе намагацца выкарыстоўваць у сваіх камандах мадэль палітычнага маркетынгу, якую «Зубр» зьлямзіў у «Гербалайфу». Валанцёрам прапануюць спаборнічаць міжсобку за індывідуальныя бонусы, як правіла, пэйджэр. Гэтая тактыка накіравана на падрыў калектыўнай сьвядомасьці.

Беларускія левыя павінны стаць на абарону правоў такой катэгорыі эксплюатаваных, як валанцёры. Джоб валанцёра вельмі нябесьпечны. У экстрыме не заступае прафэсіям зьбівальніка ледзяшоў з дахаў і дырэктара МТЗ.

Нам патрэбны адзіны нацыянальны прафсаюзны цэнтар, напрыклад, «Агульнабеларускі сындыкат валанцёраў «Клясавая вайна». Абавязковы курс сэмінараў «Што такое Сусьветная арганізацыя працы?», «Чаму мы сьвяткуем 1 Траўня». Пасьля на курултаі прадстаўнікоў каманд кандыдатаў трэба выпрацаваць свае патрабаваньні і заключыць з палітыкамі генэральную тарыфную дамову. Кандыдаты будуць заліваць пра цяжкі фінансавы стан, запрапануюць пагарбаціць задарма, у імя ідэалаў клятвы ў залі для гульні ў мяч. Ня верце.

Выбівайце абавязковыя падарункі да дня Аршанскай бітвы, спэцадзеньне для абходчыкаў кватэр, «калёсы» для рэпэраў-графіцістаў. Вулічным зборшчыкам подпісаў — халяўнае піва за шкоднасьць. Абавязкова абгаварыць гарантыі дапамогі ў выніку затрыманьня — адвакат, баул. У выпадку іміграцыі — фальшывы расейскі пашпарт на імя Барыса Нямцова.

Працадаўцы могуць пайсьці на стварэньне жоўтага прафсаюзу, лакаўты і выкарыстаньне танных штрэйкбрэхераў з «Жаночай каліцы». Таму ня выключаны варыянт страйку. Асабліва эфэктыўны г.зв. італьянскі страйк, сэнс якога — цягнуць валынку. Гадзінамі можна афармляць падпісны лісток або квасіць у таварыша. На пытаньне кандыдата, дзе быў, адпавесьці: «Абіжаеш, Статкевіч... за Эўропу жа-а а-а-агітаваў. Ік».

Вяршыня сацыяльнай барацьбы — акупацыйны страйк з захопам усіх сродкаў вытворчасьці — памяшканьняў, прынтэраў, кампутараў... Пасьля валанцёры пачынаюць самастойна кіраваць прадпрыемствам — выстаўляюць на выбары кандыдата ад свайго працоўнага калектыву і робяць яму кампанію. У выніку перамогі можна стварыць у палатцы цэлую фракцыю.

І, натуральна, не забывайцеся пра досьвед амэрыканскіх прафсаюзьнікаў 20-х, якія шмат чаго дамагліся дзякуючы каапэрацыі з Аль Капонэ.

Посьпехаў у клясавай барацьбе, дарагія таварышчы.

Лёлік Ушкін

АНАТОЛЬ КІЯЦЧУК

Бог ведае

У праваслаўных — Вадохрышча. Радуйцеся! Чарга ў Катэдральны сабор па сьвятую ваду цягнецца на кілямэтар і болей у чатыры-пяць шэрагаў. Людзей — мора: мо пяць, мо дзесяць тысячаў. Сябар мне:

— Паганцы — сьвятую ваду п'юць...

— Чаму, дружа?

— Лаюцца, хлусяць, лянуюцца, крадуць, а ў адзін дзень хочуць дараваньня й збавеньня. Для мяне гэта павярхоўная рэлігійнасьць.

Сапраўды, люд наш у большасьці спрабуе далучыцца да сьвятога не праз дух і разуменьне, а праз абрад. На жаль, ні я, ні вы, чытачу, пра плённасьць такіх спадзеваў дакладна ведаць ня можам, бо шляхі да Госпада ёсьць таямніцаю.

Фармальна і хрост, і сьвятое прычасьце можна запісаць як паганскія дзеі, бо вонкава адбываюцца нейкія незразумелыя маніпуляцыі з вадкасьцямі і прадметамі. Пратэстанты, напрыклад, пакланеньне абразам і машчам лічаць балванахвальствам. Спрачацца не вазьмуся, бо, ня маючы строга лягічных аргумэнтаў, у такой фармальнай спрэчцы пэўна прайграю. Маю аргумэнты хіба ірацыянальнага кшталту, так бы мовіць, з душы.

Ратуе вера. Ці памятаеце, у Дабравесьці жанчына, што шмат год пакутавала ад крывацечы й патраціла ўсе свае грошы на лекараў, казала сама сабе: няхай толькі дакрануся да вопраткі Ягонай — і паздаравею? Відаць, многія, хто стаіць у гэтых чэргах па ваду, кажуць самі сабе: «Няхай толькі дакрануся да сьвянцонага — і Ўсявышні мяне аслоніць».

Ці яны заблукалі, чытачу? Бог ведае.

Вацлаў Заякоць

Айсбэрг Пяцёркі+

бярэ курс на выбары

19 студзеня адбылася даўно абвешчаная прэзэнтацыя Народнай кааліцыі «5+». Гэтая «апазыцыйная калёна» арганізавалася раней за іншыя, але афіцыйна выйшла на марш адной з апошніх, упэўнена і не сьпяшаючыся. Яе лідэры сьцьвярджаюць, што здолелі аб'яднаць каля 90% суб'ектаў беларускага грамадзка-палітычнага жыцьця. Дакладна тое самае кажуць, толькі на сваю карысьць, іх апанэнты з Эўракааліцыі «Свабодная Беларусь». Хто мае рацыю, пакажуць выбары.



ЮРАСЬ ДЗЯДЗІНКІН

Васілю Старавойтаву заля наладзіла авацыю.

Гасьцей і журналістаў каля ўваходу ў Міжнародны адукацыйны цэнтар, дзе мелася адбыцца прэзэнтацыя «Пяцёркі», сустракала група сяброў КХП—БНФ. Раздавалі ўлёткі «Беларускай Салідарнасьці». На самім жа мерапрыемстве пра гэтую партыю згадаў у сваім выступе толькі Радзім Гарэцкі. Ён адзначыў, што з павагай ставіцца да КХП—БНФ, але не падтрымлівае абвешчанага ёй байкоту выбараў у палату прадстаўнікоў. «Тыя, што байкатуюць выбары, ізноў застаюцца збоку і будуць назіраць працэс», — сказаў Гарэцкі.

Прэзэнтацыю вялі Зінаіда Бандарэнка і Сяргей Законьнікаў. Яна праходзіла пад музыку з «Полацкага сшытку». Першым прамаўляў Станіслаў Шушкевіч: «Захоўваючы прывычку ўнівэрсытэцкага прафэсара, я проста растлумачу, што мы робім». Тры асноўныя пункты праграмы кааліцыі, паводле словаў Шушкевіча, — гэта незалежная Беларусь, дэмакратыя і павага да правоў чалавека. Сярод задачаў, якія стаяць перад «5+», Шушкевіч адзначыў стварэньне ўмоваў, каб нашыя грамадзяне маглі зарабляць на годнае жыцьцё, стварэньне заслону фальсыфікацыі выбараў, вяртаньне павагі да Беларусі ў сьвеце і г.д. Посьпех Народнай кааліцыі гарантаваны, калі яна застанецца адзінай, а яе ўдзельнікі будуць вышэй за «дробныя амбіцыі», сказаў лідэр БСДГ.

Сяргея Калякіна турбавала тое, што сёньня «шырака выкарыстоўваецца ўкараненьне ў апазыцыі агентаў уплыву, стварэньне фальшывых апазыцыйных цэнтраў». Кіраўнік ПКБ лічыць, што той, хто выступае супраць Народнай кааліцыі, «выступае супраць Беларусі».

Вінцук Вячорка згадаў Купалавы словы пра самае вялікае ліха беларусаў — іх саміх. «Гэтае паяднаньне адказных за Беларусь палітычных сілаў створанае беларускімі рукамі, а не інсьпіраванае звонку», — сказаў лідэр Партыі БНФ. Ён прыгадаў змаганьне за Ліцэй, моладзь, якая зьяжджае за мяжу, зьніклых палітыкаў.

Народную кааліцыю віталі старшыня Фонду імя Лява Сапегі Аляксандар Жучкоў, а таксама былы міністар Міхаіл Марыніч, які цяпер «каардынуе стварэньне Эўрапейскага руху ў Беларусі».

Анатоль Лябедзька казаў, што «5+» — «гэта першая сіла апазыцыі». Паводле словаў лідэра АГП, ужо некалькі гадоў ідуць размовы наконт стварэньня «трэцяй сілы», але яна так і не зьявілася, а цяжар палітычнай дзейнасьці ляжыць на «старой» апазыцыі. Гаворачы пра міжнародную працу «5+», Лябедзька сказаў: «Сёньня мы можам сустракацца на такім узроўні, пра які Аляксандар Рыгоравіч марыць ужо дзесяць гадоў».

Апазыцыянэры ўжо цяпер адчуваюць, якой цяжкай будзе для іх выбарчая кампанія. Дзеля перамогі яны гатовыя зьвярнуцца нават да звышнатуральных сілаў. Той жа Анатоль Лябедзька заявіў, што «быў у царкве і паставіў сьвечку за Народную каліцыю «5+». Загадкавую фразу вымавіў і акадэмік Радзім Гарэцкі: «Нашая справа падтрымліваецца з космасу». Уладзе ёсьць над чым падумаць: а ці не пляную беларуская апазыцыя займець да выбараў уласны спадарожнік?..

Прысутным на прэзэнтацыі апісалі асноўныя моманты праграмы кааліцыі. Гэта было вельмі дарэчы, бо большасьць буклетаў «5+» з кароткімі праграмамі зроблены чамусьці на ангельскай мове. Акрамя буклетаў, Народная кааліцыя распаўсюджвала таксама свае каляндарыкі і значкі. Фірмовы знак кааліцыі — стылізаваная лацінская літара «V» — «вікторыя, перамога».

Крытычных заўвагаў у адрас кааліцыі й адзінага сьпісу было мала, але яны гучалі важка. Уладзімер Колас, які выступаў ад імя Рады інтэлігенцыі і Ліцэю, сказаў, што «мы бачым, як далёка нам да сапраўднай кансалідацыі». Ён заклікаў удзельнікаў Народнай кааліцыі «падумаць, каго прапануем у якасьці кандыдатаў» і з большай павагай ставіцца да «плюсу».

Інтрыгай сталася адсутнасьць на мерапрыемстве дэпутатаў групы «Рэспубліка». Сяргей Калякін паведаміў, што яны «ў ад'езьдзе» — іх запрасілі ў Сойм Чэскай рэспублікі. Ад імя рэспубліканцаў на прэзэнтацыі выступіў іх прэс-сакратар Уладзімер Дзюба. Ён зачытаў афіцыйнае прывітаньне, у якім канстатавалася гатоўнасьць «Рэспублікі» да супрацоўніцтва, і зварот да ўсіх кааліцыяў і дэмакратычных сілаў з прапановай да сярэдзіны лютага правесьці «круглы стол» для абмеркаваньня «кансалідацыі высілкаў і каардынацыі дзеяньняў». Такая пазыцыя дэпутацкай групы натуральна ўпісваецца ў рэчышча чутак, якія зьявіліся ў апошнія месяцы: «Рэспубліка» ня думае задаволіцца знаходжаньнем у «плюсе» і зьбіраецца ісьці на выбары асобнай калёнай, а генэрал Фралоў ужо распачаў прэзыдэнцкую кампанію.

Кульмінацыяй прэзэнтацыі «5+» было падпісаньне дамовы паміж удзельнікамі кааліцыі. Свае подпісы пад дакумэнтам паставілі тры дзясяткі чалавек. Некаторыя з падпісантаў рабілі гэта з воклічам «Жыве Беларусь!» (першая — спн.Аліева). Васілю Старавойтаву заля наладзіла авацыю. Ад «моладзі» дамову падпісалі двое — Алесь Карніенка (АГП) і Алесь Міхалевіч (БНФ). Не запрасілі на падпісаньне Лявона Вольскага, які ў буклеце кааліцыі названы яе актыўным удзельнікам. Увогуле, дзеячоў культуры было мала. Ці то мала запрашалі, ці то інтэлігенцыя стала ставіцца да палітыкі з асьцярожнасьцю. Затое зноў удзельнічаць у палітычнай кампаніі зьбіраюцца спадары Ганчарык, Ярашук, Марыніч...

Найбольшую цікавасьць выклікала прэзэнтацыя супольнага сьпісу кааліцыі на выбары. «Нам ёсьць што і каго паказаць, трэба паказаць грамадзтву альтэрнатыву ў твар», — сказаў Анатоль Лябедзька. Праўда, на прэзэнтацыі было прадэманстравана ўсяго 68 твараў кандыдатаў у дэпутаты ад «5+». Прычынаў дэманстрацыі такога «абмежаванага сьпісу» некалькі: гэта, па-першае, жаданьне часова захаваць тых, хто працуе ў дзяржаўных структурах, ад рэпрэсіяў; па-другое... адсутнасьць фатаздымкаў усіх удзельнікаў сьпісу. «Вы пабачылі толькі частку айсбэргу», — зазначыў Вячорка. А Лябедзька паабяцаў, што сьпіс яшчэ часткова будзе мяняцца, бо да кааліцыі могуць далучыцца «вядомыя людзі з моцным патэнцыялам».

Падобныя прэзэнтацыі Народная кааліцыя пляную правесьці ва ўсіх абласных цэнтрах краіны. Тады і стане вядома, ці выпадкова падчас менскай прэзэнтацыі ў залі не было ніводнага ні нацыянальнага, ні дзяржаўнага сьцяга.

Сяргей Ёрш

Анатоль Лябедзька: «5+» — «гэта першая сіла апазыцыі».

Сяргей Калякін: «Хто супраць Народнай кааліцыі, той супраць Беларусі».

Акадэмік Гарэцкі: «Нашая справа падтрымліваецца з космасу».

Станіслаў Шушкевіч: «Тры асноўныя пункты — гэта незалежная Беларусь, дэмакратыя і павага да правоў чалавека».

Сьпіс Пяцёркі+

Адзіны сьпіс «5+» цалкам ня быў абнародаваны ні ў панядзелак, ні ў аўторак. Толькі ў сераду раніцай на сайце АГП зьявіўся пералік 150 магчымых кандыдатаў, прычым з агаворкай, што ён будзе зьмяняцца і ўдакладняцца.

Як і чакалася, асноўная частка дэмакратычных лідэраў пойдуць на выбары ў сталіцы. БНФ выстаўляе ў Менску В.Вячорку, Ю.Хадыку, дырэктара Беларускага ліцэю У.Коласа, экс-дэпутата В.Голубева, журналістку Ілону Ўрбановіч, эканамістаў Аляксея Янукевіча й Барыса Жалібу, Івана Саверчанку, Андрэя Церашкова. АГП — свайго лідэра А.Лябедзьку, А.Дабравольскага, Я.Лабановіча, С.Багданкевіча, С.Каралёву, Л.Гразнову.

Значна меншае прадстаўніцтва ў агульным сьпісе маюць іншыя партыі. Напрыклад, БСДГ вылучае па краіне каля 20 чалавек. У Менску пойдуць С.Шушкевіч, Алег Трусаў, С.Законьнікаў, М.Грыб. Партыя працы пакуль выстаўляе толькі 12 «штыхоў», зь якіх у сталіцы ідуць А.Бухвостаў і Генадзь Фядыніч. У «сталічным» сьпісе будзе ўсяго два сябры ПКБ, затое па краіне — 42. Затое ёсьць беспартыйныя — Міхаіл Марыніч, Уладзімер Ганчарык, Валянціна Палевікова і дэпутат палаты Уладзімер Парфяновіч.

Працяг на старонцы 5.

7% зьместу, 55% выгляду

Якімі паліттэхналёгіямі Захад узброіў беларускіх дэмакратаў

Паліттэхналёгіі ў Беларусі застаюцца прывілеем улады. Мо хто з апазыцыянэраў і хацеў бы выкарыстаць 25-ы кадар ці абстраляць аўтамабіль падчас выбарчай кампаніі, але навошта, калі па тэлевізіі гэтага ўсё адно не пакажуць. Ні тэледэбатаў, ні Шварцэнэгераў у губэрнатарах… Вось і застаецца «Пяцёрцы плюс» разьлічваць на школьныя асацыяцыі выбарцаў. Асноўнае пасланьне кампаніі — «нармальнасьць» выбаршчыкаў і кандыдатаў, а перад камэрамі лідэры кааліцыі ахвотна дэманструюць знак вікторыі.

Прафэсійна ў Беларусі паліттэхналёгіямі не займаецца ніхто. У Расеі праца паліттэхнолягаў даўно інстытуцыялізаваная. Існуе мноства фірмаў, якія прапануюць увесь спэктар паслугаў: ад аналізу акругі і ацэнкі падрыхтаванасьці канкурэнтаў да псыхалягічнага тэставаньня, трэнінгу кандыдата, напісаньня сцэнароў для відэароліка, распрацоўкі і вырабу агітацыйных матэрыялаў, правядзеньня працэдуры высоўваньня кандыдата, падрыхтоўкі пакету дакумэнтаў для рэгістрацыі, арганізацыі грамадзкай прыёмнай кандыдата, правядзеньня збору подпісаў, кампаніі «ад дзьвярэй да дзьвярэй», расклейкі ўлётак — і аж да выбараў «пад ключ».

У Беларусі палітычнага кансалтынгу не існуе. Такога віду дзейнасьці нават няма ў пераліку відаў дзейнасьці, якія падлягаюць ліцэнзаваньню. Таму для такіх паслугаў звычайна нефармальна наймаюць спэцыялістаў у сфэры PR і рэклямы. Аплачваецца праца паліттэхнолягаў з разьліку ганарар на спэцыяліста альбо на групу. У выпадку перамогі на выбарах ганарар, як правіла, падвойваецца.

Простыя словы, простыя рэчы

Большасьць паліттэхнолягаў, якія працуюць на выбарах, свае веды набылі з практыкі. Навучыцца гэтаму ў беларускіх ВНУ немагчыма. «У Беларусі не працуюць амаль ніякія тэхналёгіі, таму што адсутнічае такі важны інструмэнт, як СМІ. Да таго ж, большасьць тэхналёгій, напрыклад расейскіх, разьлічана на прапарцыйную выбарчую сыстэму, а не мажарытарную, як у Беларусі», — кажа спэцыяліст у рэкляме **Сяргей Ложкін**, паслугамі якога карыстаўся ў 2001 г. Уладзімер Ганчарык.

Дый зьвяртацца па дапамогу да спэцыялізаваных фірмаў няма патрэбы: беларускія палітычныя актывісты лічацца самымі навучанымі і таннымі мэнэджэрамі выбарчых тэхналёгій сярод усяго расейскамоўнага насельніцтва сьвету. Тэорыю і гісторыю славацкага і сэрбскага супраціву ведае на памяць кожны зубровец. Кандыдаты маюць магчымасьць навучыцца выбарчай тэхналёгіі ў сваёй партыі альбо ў замежных партнэраў. Сёлета ўжо каля 50% усіх кандыдатаў, якія ёсьць у адзіным сьпісе, прайшлі падрыхтоўку.

Аднак моцна расчараваліся б палітычныя камэнтатары з БТ, даведаўшыся, чаму навучаюць будучых кандыдатаў на сэмінарах. Галоўнае, што ўбіваюць у галовы будучых кандыдатаў замежныя і айчынныя дарадцы: кандыдат павінен гладка гаварыць, а яшчэ важней — добра выглядаць. Уражаньне ад кандыдата складаецца толькі на 7% зь зьместу ягоных прамоваў, тады як 55% вызначае выгляд. Астатняе — манера прамовы, невэрбальныя паводзіны. Замежныя тэхнолягі раяць будаваць імідж на тым, хто ты ёсьць насамрэч, а кампанію і яе «пасланьне» — тое, чым вы, уласна, жадаеце прывабіць выбарцаў, — грунтаваць на простых каштоўнасьцях, кшталту здароўя, фінансавай забясьпечанасьці цяпер і ў старасьці, адпачынку, добрай працы, добрага жытла, лепшага жыцьця для дзяцей і г.д.

Моладзевая кааліцыя «**Маладая Беларусь**» не зьбіраецца ўжываць нейкіх спэцыфічных «фішак», хоць амаль усе кандыдаты маюць багаты досьвед працы ў штабах на прэзыдэнцкіх і мясцовых выбарах. У моладзі ня будзе адной строгай стратэгіі, затое будзе адзін слоган, які пакуль абмяркоўваецца, але сэнс яго ўжо вядомы: «За маладых!»

Самая небясьпечная тэхналёгія, якой могуць навучыць замежныя кансультанты, — збор кампрамату на канкурэнта. Як галасаваў па супярэчлівых законапраектах, ці падавалі на яго ў суд, ці быў замяшаны ў скандалах, адкуль сродкі на выбарчую кампанію, ці атрымліваў дарагія падарункі.

Намесьнік старшыні БНФ **Алесь Міхалевіч** лічыць, што 99% людзей, якія прапануюць свае паслугі ў якасьці паліттэхнолягаў, — няўдаліцы і ашуканцы. «Тэхналёгіі і піяр даюць каля 20% перамогі. Усё астатняе — чарнавая праца з выбаршчыкамі».

PHOTO.BYMEDIA.NET

Чалавек пяцьсот. Астатняе — піяр

Ідэалягізаванасьць беларускага грамадзтва дазваляе заашчадзіць грошы. Шмат якія рэчы людзі гатовыя рабіць бясплатна. Паводле ацэнак расейскіх аналітыкаў, правядзеньне пераможнай кампаніі ў Дзярждуму па мажарытарнай акрузе каштавала як мінімум 300 тыс. даляраў. У Беларусі можна стаць дэпутатам, патраціўшы 100—150 у.а. на ўлёткі. Матываці валянтэраў для ўдзелу ў кампаніі могуць быць самыя розныя: дапамагчы сябру-кандыдату, падтрымаць ідэю, паглядзець на людзей...

Дэпутат Мастоўскага райсавету **Алесь Зарамбюк** за выбарчую кампанію'2003 схуднеў на 7 кіляграмаў і двойчы абышоў усю округу (тысяча выбаршчыкаў). У штабе Зарамбюка шэсьць чалавек — усе энтузіясты — і зьбіралі подпісы, і агітавалі. 20-гадовы кандыдат перамог з 75% супраць 15% за начальніка дарожнага ўчастку Горадняўтадару. І сутыкнуўся з антыагітацыяй: апанэнт распаўсюджваў яго ўлёткі, перакрэсьленыя надпісам зьверху: «Александр Зарембюк — это БНФ — Малады Фронт — Зубр». Калі Зарамбюк выступае на прэс-канфэрэнцыях, дыктафоны зашкальваюць, але ў размовах з выбаршчыкамі ён больш слухае, чым гаворыць. Выбаршчыкі гэта цэняць.

Дэпутат ІПНС **Уладзімер Парфяновіч** кажа, што самая вялікая паліттэхналёгія — хадзіць нагамі: дайсьці да кожнага выбаршчыка і стаптаць пяць пар ботаў. Для гэтага патрэбная яшчэ добрая каманда, чалавек пяцьсот. «Усё астатняе — піяр», — кажа дэпутат. На выбарах'2004 чорных паліттэхналёгій варта чакаць не ад кандыдатаў, а ад уладаў, мяркуе сп.Парфяновіч: «Давыбары ў Белаазёрску паказалі, што трэба рыхтавацца да бруду з каналізацыі. Я асабіста гэтага не баюся, але вельмі будуць перажываць мае маці і бацька. А калі штосьці зь імі здарыцца — я гэтага не дарую нікому».

А супраць лома?

Палітоляг **Уладзімер Роўда** мяркуе, што празьмернае захапленьне ў партыях паліттэхналёгіямі — гэта памылка: «Правал думскіх выбараў у Расеі паказаў, што правал нашых выбараў наканаваны. Бо наш рэжым у параўнаньні з расейскім яшчэ больш жорсткі». На думку сп.Роўды, апазыцыя не павінна рабіць стаўку на перамогу, а разглядаць выбары як сродак камунікацыі з насельніцтвам. На яго меркаваньне, патрэбна праводзіць негвалтоўныя масавыя акцыі, імпрэзы, якія б маглі зацікавіць і прыцягнуць людзей.

Відавочна, што паліттэхналёгіі не дапамогуць, калі ня будзе забясьпечаная празрыстасьць падліку галасоў, рэгістрацыі кандыдатаў. На мясцовых выбарах'2003 33% партыйных кандыдатаў не былі зарэгістраваныя. Самая папулярная прычына нерэгістрацыі — няправільнасьць запаўненьня дэклярацыі аб прыбытках, асабліва што тычыцца транспартных сродкаў.

Не зарэгістравалі такіх «небясьпечных» кандыдатаў, як Сяргей Салаш, Алег Воўчак, Яўген Лабановіч. Менавіта адсюль — канцэпцыя «Пяцёркі плюс» 110+110: 110 кандыдатаў у асноўным сьпісе і 110 дадатковых, калі ўзьнікнуць праблемы з рэгістрацыяй асноўных.

Вераніка Дзядок

Чорны піяр: каго падтрымае Тарлецкі?

Т.зв. «чорныя» паліттэхналёгіі пачаткова распрацоўваліся ў нетрах спэцслужбаў. Каб патапіць канкурэнта, можна выставіць кандыдата з такім самым, як у яго, прозьвішчам, арганізаваць ад імя канкурэнта начныя тэлефанаваньні, раздачу прадуктовых набораў нізкай якасьці, зварот прадстаўнікоў сэксуальных меншасьцяў у падтрымку апанэнта. Можна справакаваць заўчасны пік папулярнасьці апанэнта або «перасаладзіць» інфармацыю пра яго.

А можна абнародаваць сумнеўныя і лёгка абвяргальныя абвінавачаньні на адрас «свайго» кандыдата, у якіх патоне сапраўдны кампрамат. Ёсьць яшчэ спосаб «паляваньне на мядзьведзя зь бервяном»: кандыдат умела падстаўляецца пад атакі апанэнтаў ці начальства, зарабляючы сабе імідж змагара за народную праўду. Або «лахатрон»-таталізатар. За тыдзень да галасаваньня абвяшчаюцца фальшывыя вынікі галасаваньня ў таталізатар або сацыялягічнага апытаньня (перамагае «наш» кандыдат). Калі выбарцы прыходзяць у выбарчыя кабінкі, па маторнай памяці галасуюць за гэтага ж кандыдата...

Усе гэтыя прыёмы шырока выкарыстоўваюцца ў Расеі. Палітолягі кажуць, што росквіт такіх тэхналёгій ёсьць прызнакам палітычнай несьвядомасьці грамадзтва. Гэта звычайная зьява для краін, якія толькі атрымалі дэмакратыю. Так было ў Афрыцы ў сярэдзіне XX ст. Але такога ніколі не адбывалася ў Вялікай Брытаніі.

Амэрыканцы раяць

Кандыдатам важна: не закладаць свайго дому, не закладаць сваёй душы, не забывацца на дні народзінаў блізкіх людзей. Ідэальны кандыдат мусіць мець тоўстую скуру, хуткую рэакцыю, вострыя зрок і слых, хуткія ногі, моцную сьпіну, добрае сэрца і моцна ціснуць руку.

Джозэф Гейлард

«Маленькія хітрыкі перадвыбарчай барацьбы. Што падыходзіць і што не падыходзіць для выбарчай кампаніі» (падручнік, падрыхтаваны для Расеі Міжнародным Рэспубліканскім інстытутам).

Як нас агітавалі ў 2001-м

Сямён Домаш у адной з перадвыбарчых прамоваў сказаў, што нельга аддаць Беларусь у рукі «няўмелага ганчара». Пад гэтым ярлыком многія пазналі Ганчарыка. «Навязваньне ярлыкоў» — форма стварэньня нэгатыўнага іміджу канкурэнта.

Паводле правілаў палітычнага піяру, кожнай пэўнай групе выбарцаў мае быць адрасаванае асобнае «пасланьне». Так рабілі ў Барысаве: расклады футбольных гульняў з агітацыяй — заўзятарам футболу, расклады электрычак — дачнікам. Студэнтам — асадкі з датай выбараў. Любы прадмет, зь якім можна гуляцца, трымаць у руках, — у рукі. Майкі-выбірайкі з сонейкам — самым сэксапільным зубрыцам.

На рок-канцэртах вашы любімыя зоркі (Алсу, напрыклад) ненавязьліва раілі прыйсьці на выбары і прагаласаваць за...

І нават праз мабільнікі прыходзілі SMS-ы: «Sustreniemsia na vybarchym uchastku».

А раздача прэзэрватываў з перадвыбарнай сымболікай, была, бясспрэчна, самай запатрабаванай формай працы з студэнтамі.

Дык падпісвайся!

Падпісацца на «НН» можна на любой пошце. У Менску таксама прымаецца **падпіска на шапікі «Белсаюздруку»** або праз прыватныя сыстэмы дастаўкі **«Эй Бі ПрэсСэрвіс» і «Рэм-Інфо»**. «Наша Ніва» — крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. Падпісны індэкс 63125.

Мой кандыдат

Голас маладога

Калі я быў малы, тата ці дзядуля заўсёды бралі мяне з сабою на выбары і даручалі самае адказнае — апусьціць бюлетэнь у скрынку. Я і цяпер малы, бо ня маю пакуль права голасу. Для ЦВК я — ніхто. Але праз год я стану каштоўным чалавекам для сваёй дзяржавы, і мяне пачнуць з усіх бакоў апрацоўваць, інфармаваць, інструктаваць.

На выбары я, хутчэй за ўсё, пайду. Бо гэта — пячатка на маёй дарослась, атрыбут грамадзянства, вялікі гонар для любога чалавека.

Мне патрэбны кандыдат. Ня дужа стары, бо «ў Сьцяпаныча з трэцяга пад'езду маразм крапчае з кожным днём». Але ж і не занадта малады, бо мой сябар Віталік толькі і можа, што піва жлукціць ды казаць «тру». Гэта пэўна не стаханавец з Камвольнага камбінату і дакладна не дырэктарка раддому. Бо адзін «любімчык калектыву», а другая — «тыранічная сьцерва». Гэта пэўна не дачка якіх-небудзь пятроміронычаў і ня сын дырэктара абутковай фабрыкі. Кандыдат мой павінен у сваёй выбарчай праграме дзяліцца плянамі працы, выканаьне якіх падаецца мне цалкам рэальным. Ён ні ў якім разе ня будзе раздаваць абяцанкі кшталту «свабоду папугаям», «бясплатныя дыскатэкі студэнтам», «пэнсіянэрам — годную пэнсію».

Гэта — спакойны, прыемны чалавек, які на сустрэчы з выбаршчыкамі дасьць нумар свайго хатняга тэлефона са словамі: «Калі мяне выбяруць, тэлефануйце з вашымі праблемамі». Гэты чалавек вольна размаўляе са мной па-беларуску, а перад чыноўнікамі абараняе мае інтарэсы на той мове, на якой да іх хоць што-небудзь дойдзе. Пасьля таго, як яго выбяруць дэпутатам, я буду бачыць яго ня толькі па тэлебачаньні. Магчыма, гэта былы вайсковец, але ні ў якім разе ня дзейсны! Ён — ня бард, не пісьменьнік. Бо адзінае прыемнае выключэньне паэта-кіраўніка — Генадзь Бураўкін.

Мой кандыдат — беспартыйны. У гэтым выпадку я хоць трохі веру, што абараняць ён будзе інтарэсы маёй сям'і, а не сваёй партыі. Я буду ведаць, што мяне ня выкарысталі адно для таго, каб правесьці як мага болей прадстаўнікоў гэтай партыі. Але вызначэньне «беспартыйны» не выключае, што па духу майго кандыдата можна аднесьці да «зялёных» ці яшчэ якіх «ружовых».

Мой кандыдат здольны назваць найвышэйшую кропку Беларусі ды першага князя ВКЛ. Ён, як напісаў паэт Сяргей Прылуцкі, можа адрозьніць паняткі «густ» і «смак».

Магчыма, гэта журналіст. Бо журналісты да народу бліжэйшыя нават за кантралёраў «сотага» аўтобуса. Можа, гэта юрыст. Бо проста крычаць «Даеш беларускую мову!» і я магу. Мне трэба, каб мой кандыдат казаў у парлямэнце: «Даеш беларускую мову ў адпаведнасьці з артыкулам...» У той жа час, мой кандыдат ведае, што такое Інтэрнэт, ды можа самастойна разабрацца ў мэню мабільніка. Бо ён — не тугадум. Мой кандыдат у стане даць хуткі лягічны адказ на дакладнае пытаньне. Бо ён — ня тормаз.

Урэшце, мой кандыдат ня скажа: «Меня, как русского человека, радует, что Лицей закрыли».

Бо мой кандыдат — беларус. І ня толькі па савецкім пашпарце.

Глеб Лабадзенка, навучэнец Беларускага ліцэю

Сьпіс Пяцёркі+

Працяг са старонкі 3.

АНДРЭЙ ТАКІНДАНГ

БНФ выставіла па Менскай вобласьці чатырох дэпутатаў мясцовых Саветаў: Вольгу Галубовіч, Юрася Зянковіча, Алеся Міхалевіча і Канстанціна Шпунтова. На Валожыншчыне будзе балятавацца знакаміты майстар-мэбляр з Івянцу Вінцэнт Солтан. Цікава, што ў сьпісе згадваецца як кандыдат ад Фронту з Барысава Зьміцер Бародка, ён жа каардынатар Эўракааліцыі «Свабодная Беларусь». Сам Бародка кажа, што не выключае магчымасьці балятаваньня ад БНФ. «У рэгіёне не праблема, ад каго будзеш ісьці на выбары, ад «Свабоднай Беларусі» ці «Пяцёркі +», — гаворыць Бародка. — Я лічу, што гэтыя два блёкі павінны аб'яднацца». У Барысаве пойдзе на выбары і старшыня цэнтру «Скрыжаваньне» Сяргей Салаш.

Ад БСДГ ідзе на выбары А.Кароль, а ад працавікоў — Т.Ваніна. ПКБ выстаўляе ў вобласьці кіраўніка камсамольцаў З.Яненку і рэдактара газэты «Товарищ» С.Вазьняка.

Раманчук — у Горадні, Іпатава — на Гарадзеншчыне

На Гарадзеншчыне будзе балятавацца пісьменьніца Вольга Іпатава (БСДГ). Фронт выстаўляе ў Горадні дэпутата мясцовага Савету, старшыню Незалежнага прафсаюзу «Азоту» С.Антусевіча і двух навукоўцаў — кандыдата мэдычных навук С.Мальчыка і прафэсара А.Астроўскага. У Слоніме будзе балятавацца фронтавец, лекартраўматоляг, дэпутат Іван Шэга. Разам зь ім ідзе кіраўнік слонімскіх камуністаў з ПКБ, былы дэпутат мясцовага Савету Віктар Герасімчык. У Наваградку ідзе на выбары былая дэпутатка Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня Г.Сямдзянава, а ў Лідзе — галоўны рэдактар «Нашага слова» Стась Суднік. АГП выстаўляе ў Горадні мясцовага партыйнага кіраўніка Ю.Істоміна і менскага эканаміста Я.Раманчука. Як беспартыйныя пойдуць на выбары гарадзенцы Аляксандар Мілінкевіч і Тадэвуш Гавін.

На Віцебшчыне найбольш кандыдатаў БНФ гатовы выставіць у Наваполацку — у тым ліку дэпутата мясцовага Савету Васіля Главацкіх, прафсаюзнага дзеяча Вадзіма Духаменку і пэдагога Зьмітра Салаўёва. Абласны лідэр БНФ Кастусь Смолікаў пойдзе на выбары ў Віцебску. Леанід Гаравы будзе балятавацца ад БСДГ у Гарадку.

Супраць Канаплёва — кіраўнік БНФ

Адной з найбольш праблематычных для апазыцыйных кандыдатаў заўсёды была Магілёўшчына — айчына Лукашэнкі і кузьня кадраў для яго. У Шклове БНФ выстаўляе абласнога партыйнага кіраўніка, агранома-фэрмэра Рыгора Костусева, у Дрыбіне — прадпрымальніка Андрэя Юркова. У Крычаве будзе балятавацца вядомы мастак Алесь Марачкін. Ад АГП ж у дэпутаты зьбіраюцца Ўладзімер Гайдукоў і Ўладзімер Шанцаў.

Калякін — у Гомелі

С.Калякін — адзіны зь лідэраў «5+», які вырашыў ісьці ў правінцыі, у Гомелі. Ён кажа, што працаваў на Гомельшчыне падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2001 году. А цяпер выбаршчыкі прапанавалі Калякіну балятавацца менавіта там, і ён пагадзіўся. АГП тутака ўключыла ў агульны сьпіс маладога лідэра Алеся Карнієнку, дэпутата са Жлобіна Марата Афанасьева, экс-дэпутата СССР Юр'я Варонежцава. Лібэральнае прадстаўніцтва на Гомельшчыне найбольшае.

Ніякіх новых імёнаў пакуль ня выявілася і на Берасьцейшчыне. У вобласьці на сёньня вылучаныя восем фронтаўцаў: дэпутат зь Белаазерску Юрась Губарэвіч, дэпутат з Маларыты Ўладзімер Малей, кіраўнік БНФ у Баранавічах інжынэр Алесь Грыцавец, а разам зь ім — баранавіцкі прадпрымальнік Віктар Мязяк. У Берасьці Фронт выстаўляе і навукоўца Ірыну Лаўроўскую ды грамадзкага дзеяча Зьмітра Шыманскага. У Столінскім раёне пойдзе на выбары былы адказны сакратар управы БНФ, афіцэр у адстаўцы А.Кавалец. У Лунінцы мяркуе балятавацца сябар БСДГ, былы дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня П.Знавец.

Няма ў сьпісе некалькіх чаканых прозьвішчаў, якіх абяцаў у сваіх інтэрвію Анатоль Лябедзька. Адсутнічаюць, напрыклад, Васіль Шлындзікаў, Генадзь Грушавы. З дэпутатаў «Рэспублікі» ў сьпісе толькі Парфяновіч. У той жа час, некалькі чалавек са сьпісу ў гутарках з карэспандэнтам «НН» наракалі на сваё ўключэньне ў сьпіс, кажучы, што ня маюць ахвоты ісьці на выбары і пакуль адно падпарадкоўваюцца партыйнай дысцыпліне і просьбам лідэраў партый.

Алег Тачоны

Народная кааліцыя «Пяцёрка+»

Тэзысы праграмы

Народ Беларусі мае права на годнае жыцьцё, на ўпэўненасьць у будучыні і на ўрад, які сумленна выконвае свае абавязкі. Беларусь павінна быць незалежнай, дэмакратычнай і свабоднай краінай, паважанай у сьвеце. Дзеля гэтага мы, грамадзяне Беларусі — прадстаўнікі партый, грамадзкіх і палітычных арганізацый — падпісваем пагадненьне аб супрацоўніцтве. Мы ствараем новую, адзіную сілу, здольную вырашыць галоўныя праблемы нашай краіны і яе людзей. Мы аб'ядноўваемся ў Народную кааліцыю «Пяцёрка плюс». Наша пагадненьне — гэта праграма канкрэтных спраў, якія мы пачынаем тут і цяпер дзеля вываду Беларусі з крызысу. Мы будзем працаваць разам дзеля пераменаў. Мы зьвяртаемся да ўсіх людзей Беларусі, да партыяў, да грамадзкіх арганізацыяў і рухаў, да тых, хто працуе ў дзяржаўных структурах: Вашая падтрымка Народнай кааліцыі «Пяцёрка плюс» зробіць перамены да лепшага рэальнымі. Нас з Вамі большасьць — разам мы моцныя, разам мы вернем народу годнасьць і дабрабыт, а нашай дзяржаве — росквіт і павагу.

Удзельнікі Народнай кааліцыі «Пяцёрка плюс» распрацавалі канкрэтныя прапановы і законапраекты дзеля неадкладнага паляпшэньня эканамічнай сытуацыі ў краіне, павышэньня ўзроўню жыцьця ўсіх людзей. Незалежна ад палітычных меркаваньняў, мы будзем разам дамагацца рэалізацыі сваёй праграмы.

Пяць крокаў да лепшага жыцьця

1. Годнае жыцьцё — кожнаму

Плаціць па справядлівасьці. Прывесьці ўзровень мінімальных заробкаў і пэнсій у адпаведнасьць з рэальным пражытачным узроўнем, які забясьпечыць кожнаму чалавеку і кожнай сям'і годнае жыцьцё.

Абараніць пэнсіянэраў. Забараніць павышэньне пэнсійнага ўзросту і няпыплату пэнсій пэнсіянэрам, якія працуюць.

Нармальная кватэрная плата. Прывесьці аплату жытла і камунальных паслуг у адпаведнасьць з рэальнай плацежаздольнасьцю.

Забясьпечыць эканамічны пад'ём. Стварыць спрыяльныя ўмовы для работы прадпрыемстваў усіх форм уласнасьці, спыніўшы бюракратычнае ўмяшальніцтва ў эканоміку і цкаваньне кіраўнікоў. Прыцягнуць інвэстыцыі, вярнуўшы давер да Беларусі як да партнэра.

2. Даць працаваць людзям

Стымуляваць стварэньне новых працоўных месцаў. Спрасьціць рэгістрацыю суб'ектаў гаспадараньня і грамадзкіх арганізацый. Забараніць іх перарэгістрацыю. Ліквідаваць непатрэбныя квоты, ліцэнзіі і дазволы.

Абараніць працоўных. Адмяніць прымусовую сыстэму найму па кантракце на дзяржаўных прадпрыемствах.

Спыніць паборы. Забараніць дзяржаўным органам незаконна зьбіраць сродкі з суб'ектаў гаспадараньня. Забараніць пераразьлік раней выплачаных падаткаў.

3. Улада для народу

Адзін закон для ўсіх. Забясьпечыць рэальную роўнасьць усіх перад Законам, незалежнасьць і справядлівасьць суду.

Не — трэцяму тэрміну! Забясьпечыць выкананьне Канстытуцыі, якая абмяжоўвае займаньне пасады прэзыдэнта двума тэрмінамі запар.

Казаць людзям праўду. Прыцягваць да адказнасьці афіцыйных асобаў за ўтойваньне інфармацыі альбо даваньне няверных зьвестак, датычных правоў і інтарэсаў грамадзян, за ціск на сродкі масавай інфармацыі.

Народнае самакіраваньне. Устанавіць выбарнасьць кіроўных асоб мясцовай адміністрацыі і іх поўную справаздачнасьць перад выбарнікамі.

Справядлівыя выбары. Прывесьці закон аб выбарах у адпаведнасьць зь міжнароднымі нормамі. Забясьпечыць грамадзкі кантроль выбараў і крымінальную адказнасьць за фальсыфікацыю выбараў.

4. Народныя грошы — на службу народу

Адкрыты бюджэт. Выключыць фінансаваньне дзяржаўных структур зь невядомых крыніц. Забясьпечыць празрыстасьць бюджэту і падкантрольнасьць яго парлямэнту.

Ліквідаваць незаконныя фонды. Правесьці разбор фактаў незаконнага выкарыстаньня дзяржаўных сродкаў адказнымі асобамі краіны. Прыцягваць да адказнасьці за стварэньне некантраляваных фондаў і незаконную практыку крэдытаваньня і льготаў для асобных прадпрыемстваў.

Грошы — дзецям. Скараціць выдаткі на апарат адміністрацыі і аховы прэзыдэнта і выкарыстаць гэтыя сродкі на сацыяльную дапамогу малазабясьпечаным, шматдзетным і няпоўным сем'ям.

5. Павага ў сьвеце

Давер да Беларусі. Адмовіцца ад палітыкі самаізаляцыі. Выконваць міжнародныя дамовы і абавязальніцтвы, узнавіць удзел ва ўсіх міжнародных структурах.

Сябраваць з суседзямі. Наладзіць узаемавыгадныя сяброўскія адносіны з усімі суседнімі краінамі і з краінамі Эўразьвязу.

Цывілізаваныя межы. Забясьпечыць грамадзянам Беларусі свабоднае перасоўваньне праз межы ўсіх суседніх краін.

Міжпартыйны інфармацыйны цэнтар 5plusinfo@tut.by

КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Плягіят пакараны

У нашай краіне, дзе можа абваліцца столь у Нацыянальнай філярмоніі, дзе ўжо чвэрць стагодзьдзя ня могуць дакончыць рэканструкцыю Нацыянальнага музэю, а пэрспэктыва пабудовы Нацыянальнае бібліятэкі губляецца ў тумане далёкае будучыні, гаварыць пра меншыя праблемы нібы й не прынята. Напрыклад, каго ў Беларусі можа цікавіць праблема плягіяту?

Найперш саміх пацярпелых — творцаў, плёнам працы якіх скарысталіся бязь іх ведама. Зусім невялікая, здавалася б, купка людзей. Але здабыткі плягіяту мусяць спажываць мільёны людзей. Ад гімнаў да этыкетак, ад фатаздымкаў да рэклямных слоганаў, ад паштовак да відэа...

Што ж такое плягіят? Гэта слова паходзіць з лаціны: plagiatus — украдзены; plagium — крадзеж. Плягіят — гэта прысабечваньне чужога твору, творчай ідэі або задумы, памнажэньне яго пад сваім прозьвішчам, запазычаньне з чужых твораў, апублікаванае як арыгінальнае; літаратурны, мастацкі, навуковы крадзеж. Калі яшчэ прасьцей, плягіят — злачынства, што прыносіць злодзею прыбытак.

У Беларусі «не прынята» скандаліць. Людзі аддаюць перавагу пэрсанальным кантактам. У гэткім закулісным рэчышчы былі вырашаныя дзясяткі справаў, што тычыліся плягіяту. І ў тым ёсьць свая рацыя. Бо пацярпелы эканоміць багата часу й нэрваў, а віноваты беражэ свой імідж. Разам эканомяць грошы на судовых выдатках.

Дзяніс Раманюк і фабрыка «Камунарка»

Гэтак вырашыў сваю праблему мастак і выдавец Дзяніс Раманюк. Фабрыка «Камунарка», не спытаўшы дазволу ў сям'і, зьмяшчала малюнкі ягонага бацькі, Міхася Раманюка, на сваёй прадукцыі. Спадкаемцам прасьцей было ўсё вырашыць праз тэлефон, чым рабіць шоў з судом.

У гэткі ж спосаб быў гатовы ўзгодніць свае прэтэнзіі й славуты фотамастак Анатоль Кляшчук. Але здарылася загваздка: патэнцыйны адказчык не зразумеў наагул, чаго хоча творца. А ён хацеў, каб выдавец кнігі, які выкарыстаў без дазволу аўтара здымак для аздабленьня вокладкі, прызнаў хоць бы сам факт некарэктных паводзінаў. Цяпер сп.Кляшчук паспрабуе давесьці сваю рацыю ў судзе.

Віктар Сташчанюк і Хлебазавод №1

І Віктар Сташчанюк марна чакае хоць бы простага паведамленьня ад плоймы плягіятараў, што карыстаюцца яго творамі з графічнае нізкі, прысьвечанай старому Менску. Апошні выпадак — хлеб «Менскі», этыкетка якога аздобленая малюнкам Сташчанюка. Кіраўніцтва хлебазаводу №1 мо й не ўяўляе сабе сутнасьці праблемы. А вось шматлікія плягіятары, якія выдаюць паштоўкі з творамі Сташчанюка, выдатна ўсё разумеюць. Менавіта на гэтым грунтуецца іх прыбытак. На крадзяжы, ці плягіяце!

Парадокс: галоўным парушальнікам аўтарскіх правоў у Беларусі ёсьць дзяржаўныя прадпрыемствы. Але й адзіным абаронцам творцаў выступае тая ж дзяржава. Самы ж беспрэцэдэнтны выпадак плягіяту на дзяржаўнай аснове — выкарыстаньне вобразаў, створаных скульптарам Сяргеем Адашкевічам, на беларускіх грашовых знаках. Пяцісотрублёўка скульптурамі Адашкевічавымі аздобленая з абодвух бакоў. І што з таго старому мастаку? Нічога! Нуль.

Між тым аўтарскія правы насьледуюцца цягам пяцідзесяці гадоў. Гэта для даведкі.

Уладзімер Крукоўскі і Завод мэталавырабаў

Летась судовую справу аб плягіяце выйграў мастак Уладзімер Крукоўскі. Справа вялася вакол выкарыстаньня выявы ягонага плякату да опэры «Сівая легенда» ў рэкляме вытворцаў моцных дзьвярэй. «Я абзваніў канторааў дзесяць! — апавядае Крукоўскі. — Ніхто ў аўтарскім праве не валачэ. Дазваніўся, нарэшце, да Калегіі адвакатаў, там ёсьць спэцыялізаваная кантора №4, што займаецца выключна абаронаю аўтарскіх правоў і патэнтамі... Я зьвярнуўся там да супрацоўніцы. Яна пабачыла, што справа бясспрэчная. Я прадэманстраваў колькі рэпрадукцыяў з колішніх публікацыяў. Узялі, вядома, зь мяне грошы. Казалі спачатку — 450 тысячаў. Але як я непрацуючы пэнсіянэр, то зьлітаваліся, зьнізілі мне суму да 250 тысячаў. Адвакатка наведала бібліятэкі, высьветліла, што рэкляма была ў дзьвюх газэтах. Гэтага хапіла. Напісалі іскавую заяву, занёс яе ў суд. Была праблема знайсьці адказчыка. На першую размову ён не зьявіўся, чым падпсаваў свой імідж. Ён дылер Фаніпальскага заводу мэталічных вырабаў.

Суд адбыўся 6 лістапада. Я выйграў. Два мільёны шэсьцьсот тысячаў рублёў. Пакрыў выдаткі на працэс. Трэба было выплаціць і судовае мыта, што складае 10% ад запатрабаванай сумы кампэнсацыі. Я патрабаваў 500 базавых адзінак. Базавая адзінка тады была 14 тыс. (16,5 тыс. на сёньня). А паводле артыкулу №40, пункт 2 «Закону аб абароне аўтарскіх правоў», прадугледжаная кампэнсацыя за разавае парушэньне. У маім выпадку было 77 парушэньняў. А за адзін раз можна патрабаваць ад 10 да 50 000 базавых адзінак! Пад мільярд! Я ўзяў сьціпла. 500 базавых адзінак. Сем мільёнаў. Гэткіх грошай мне не далі, бо адказчыкам была прыватная асоба, а не прадпрыемства ці ўстанова».

Мікола Купава і Гомельскі лікёра-гарэлачны

Добры прыклад, што падаў сп.Крукоўскі, стаў узорам і для іншых. Днямі мастак Мікола Купава выйграў справу ў Гомельскага лікёра-гарэлачнага заводу. Створаны Купавам партрэт князя Вітаўта выкарысталі ў якасьці цэтліка да гарэлкі.

Нават у сёньняшнім сваім выглядзе беларуская дзяржава мусіць дбаць пра сякую-такую ўласную ж законнасьць. Гэта, да прыкладу, як спытаць у міліцыянта: «Каторая гадзіна?» У гэтай дзяржаве мы непазьбежна сутыкаемся з фактам яе існаваньня. У адным выпадку дзяржаўныя ўстановы крадуць інтэлектуальную ўласнасьць, а ў іншых — становяцца тымі самымі «дзядзямі-міліцыянтамі», якія ратуюць нас ад хаосу.

Сяргей Харэўскі

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Супярэчлівыя весткі пра балтыйскі газаправод

Прэм'ер-міністар Расеі Міхаіл Касьянаў падпісаў пастанову аб пабудове Паўночнаэўрапейскага газаправоду праз Балтыйскае мора ў Нямеччыну. Кошт праекту — каля $6 млрд. Тым часам прадстаўнік Эўракамісіі выказаў падтрымку праекту пабудовы другой чаргі «Ямалу—Эўропы» праз Польшчу й Беларусь. Фаўзі Бэнсарса, высокапастаўлены чыноўнік у ведамстве камісара ЭЗ па энэргетыцы й транспарце, зрабіў гэта ў Варшаве ў часе цырымоніі зацьвярджэньня ўрадамі Польшчы й Украіны ўгоды ў справе нафтаправоду Адэса—Броды. Аргумэнт — другі «Ямал» каштаваў бы ў 6 разоў таньней за балтыйскі газаправод.

Рэкордныя прыбыткі «Газпрому»

Зыскі «Газпрому» ўзрасьлі ў 2003 на 25% — да $16,5 млрд. Гэта найлепшы паказчык за 30 гадоў, дасягнуты дзякуючы надзвычай высокаму ўзроўню цэнаў.

Арыштаваны заснавальнік Лагойскае вінакурні

Пракуратура абвінаваціла грамадзяніна Ізраілю Ігара Турка ў тым, што ён у 2001 г. у часе працы намесьнікам дырэктара Лагойскага лікёра-гарэлачнага заводу разам з адным з заснавальнікаў прадпрыемства Чэславам Скаржынскім узялі крэдыт у «Беларускім індустрыяльным банку» ($300 000), скарыстаўшыся фальшывымі дакумэнтамі. Пасьля гэтага грошы пералічылі праз падстаўных асобаў на рахунак прадпрыемства-аднадзёнкі ў адзін з маскоўскіх банкаў. Сп.Турак пасьля звольніўся з Лагойску і ўладзіўся інжынэрам у адну менскую фірму. Ён працаваў там да 6 сьнежня, пакуль менская пракуратура яго не арыштавала.

«Дажынкі» ў Ваўкавыску

Сёлетнія «Дажынкі» пройдуць у Ваўкавыску. Фэст прыносіць раёну-арганізатару мільярдныя інвэстыцыі ў парадкаваньне і рамонт.

Кандытары гуртуюцца

Чатыры найбуйнейшыя вытворцы ласункаў — «Спартак» (Гомель), «Камунарка» (Менск), «Чырвоны мазыранін» (Нароўля), «Слодыч» (Менск) абавязаліся працаваць на айчынным рынку ў роўных умовах. Рашэньне прынятае на нарадзе ў Гомелі. Гэтыя чатыры заводы вырабляюць каля 75% усіх слодычаў краіны. Угода прадугледжвае ўніфікацыю адтэрміновак у плацяжах і камісійных узнагародаў.

«Вольва» ў Горадні?

Скончыліся кансультацыі аб разьмяшчэньні ў Гарадзенскай СЭЗ вытворчасьці дэталяў для «Вольва» і «Сканіі» на базе заводу аўтаагрэгатаў «Мінцяжлёгмаш» і «Радыёхваля». Вынік няясны.

Прафсаюзы хочуць паляваць

ФПБ прагне ўзяць у арэнду на 30 гадоў паляўнічыя ўгодзьдзі ў Лагойскім і Барысаўскім раёнах для стварэньня «ўзорнае паляўнічa-рыбацкае гаспадаркі ФПБ». Справа выйшла на паверхню пасьля таго, як забіла трывогу група сяброў Таварыства паляўнічых і рыбакоў.

Атрошчанкаву абламілася

Брытанскія мільярдэры браты Барклаі купляюць кампанію «Hollinger Int.», якая валодае газэтай «Daily Telegraph». Кошт гешэфту складзе $468 млн.

Шэры рынак жыве гадамі

Абароты «чорнага рынку» ў Італіі складаюць амаль 550 млрд эўра. Такія высновы робяць італьянскія дасьледчыкі. Прыбытак нелегальных прадпрыемстваў ацэньваецца ў 200 млрд эўра. Прыхоўваньне прыбыткаў цягне недаплату падаткаў на 210 млрд у год. 15 млрд дае выпуск тавараў падробных фірмовых марак. 55 млрд эўра прыносіць незаконная букмэкерская дзейнасьць. Нарэшце, за скамбінаваныя аўтамабільныя аварыі круцялям удаецца спаганяюць 305 млн эўра ў год. Ці ня тое самае ў прапорцыях адбываецца і ў сінявокай бацькаўшчыне?

Гіганцкая сонечная ЭС

Найбольшая сонечная электрастанцыя сьвету паўстане ў Ляйпцыгу, які знаходзіцца трохі паўднёвей Гомелю ці Берасьця. Яе будуе «Royal/Dutch Shell» за 22 млн эўра. Станцыя магутнасьцю 5 мВт будзе забясьпечваць токам 1800 кватэраў у наваколлі Ляйпцыгу — аднаго з найбуйнейшых гарадоў Усходняй Нямеччыны.

«Кодак» пераходзіць на лічбу

Фотаканцэрн «Eastman Kodak» спыніў продаж звычайных апаратаў на рынках ЗША, Канады і Заходняй Эўропы. Звычайную фатаграфію адусюль выціскае лічбавая.

МБ; БелаПАН; радыё «Свабода»

Небаракі ў бараках

Мясцовыя ўлады сутыкаюцца з праблемаю баракаў. Ведаючы пра будучы знос, у бараках прапісваліся ўсе, хто толькі мог. Цяпер, каб перасяліць адзін барак на 30 пакояў, трэба збудаваць два пад'езды дзевяціпавярховіка. Аднак грошай няма.

ВІТАЛЬ ШАРШНЁЎ

Дваццаць чатыры месяцы 73-гадовая старая судзілася зь Міністэрствам абароны, каб атрымаць новую кватэру. Марыя Анойкіна 40 гадоў жыла ў Баранавічах у бараку, пабудаваным яшчэ за Мікалаем II. Той будынак напалову выселены, уначы па ім цёгаюцца бамжы й пацукі, бярвеньні ў сьценах струхлелі, дах цячэ. Зараз старой павінна быць прапанавана нармальнае жытло і кампэнсацыя судовых выдаткаў.

На пачатку 2002 г. барак лічыўся на 80% непрыдатным для жыцьця. Падчас судовых разьбіральніцтваў яго непрыдатнасьць зьнізілася да 70%. І баранавіцкі суд вырашыў, што жыць у тым бараку магчыма. Марыя Анойкіна зьвярнулася ў Вярхоўны суд, які адмяніў рашэньне баранавіцкага і вярнуў справу на перагляд.

Падчас новага разгляду праўду Анойкінай прызнаў толькі кіраўнік домакіраваньня Ўладзімер Макрыцкі, які пагадзіўся, што нельга зьдзекавацца зь людзей. Міністэрства абароны нават пасьля судовага рашэньня заявіла, што ня мае грошай на кватэру для Анойкінай і будзе аспрэчваць пастанову. Вайскоўцы разумеюць, што зараз суд заваляць падобнымі заявамі. У Баранавічах на сёньня маецца 14 гэткіх баракаў, у якіх прапісана 185 сем'яў.

За савецкім часам у былыя царскія кашары, а потым польскія стайні, засялялі афіцэрскія сем'і. Аднак нават тады войску не ставала грошай, каб усе іх пабурыць і збудаваць шматпавярховікі. Бо, ведаючы пра будучы знос, у тых бараках прапісваліся ўсе, хто толькі мог. Каб перасяліць адзін барак на 30 пакояў, трэба збудаваць амаль два пад'езды дзевяціпавярховіку.

Руслан Равяка, Баранавічы

Штраф, у сорак разоў меншы

У Бабруйску адбыўся суд паводле пазову былога старшыні райвыканкаму Віктара Шчэцькі да былога дырэктара Асіповіцкага кансэрвавага заводу М.Ткачэнкі аб абароне гонару і годнасьці. Прычынай стаўся артыкул «Сьвеціць «вэртыкальная» зорка», надрукаваны ў «БДГ» і перадрукаваны мясцовай незалежнай газэтай «Панарама». Там В.Шчэцьку вінавацілі ў службовых злоўжываньнях. Ёсьць меркаваньне, што інфармацыю для «БДГ» «зьліў» былы дырэктар кансэрвавага заводу М.Ткачэнка, які быў спачатку прызначаны, а потым звольнены В.Шчэцькам. Пасьля публікацыі Шчэцька падаў у суд пазоў аб абароне гонару і годнасьці, якія ацаніў у 20 млн руб. Суд прызнаў М.Ткачэнку вінаватым у распаўсюджваньні непраўдзівых зьвестак і прызначыў выплаціць 500 тыс.

Паводле сьцьверджаньняў сьведкаў, В.Шчэцька быў разьюшаны малым памерам сумы. Да таго ж, абарона зьбіраецца падаваць касацыйную скаргу. Дый пазову да «БДГ» у суд не паступала.

Гэта ўжо другі вялікі «працэс» Шчэцькі, зьвязаны з Асіповічамі. У 2001 г. на ягоную заяву асіповіцкая пракуратура распачала, а потым вымушаная была зачыніць крымінальную справу на рэдактара «Панарамы» М.Тамашова «па факце паклёпу»... праз адсутнасьць факту злачынства.

Рыгор Латышэвіч, Асіповічы

Падатку на коней ня будзе

У Брожы (Бабруйшчына) зь вяскоўцаў летась патрабавалі падатак за коней і трактары. За жывога каня даводзілася выкладваць 33 тыс. рублёў на год, а за «жалезнага» — 82,5 тыс. З гэтага году «падатак на коней» адмянілі. «За коней і трактары мы сабралі 10 мільёнаў рублёў. Усе грошы пайшлі на парадкаваньне гэтых жа вёсак. Могілкі ў Брожы палепшылі, дарогу адрамантавалі, платы паставілі новыя», — распавядалі ў сельсавеце. Меркавалі гэты падатак распаўсюдзіць на ўсю тэрыторыю рэспублікі, але Рада Міністраў, пачуўшы пратэсты Мінсельгаспхарчу, перадумала.

Паводле БелаПАН

Прывезьлі з Масквы

Днямі ў Астраўцы пахавалі 24-гадовага хлопца. Перад гэтым ён паехаў на заробкі на маскоўскія будоўлі з сваімі сябрамі. Вечарам яны зайшлі ў кавярню, а калі вярталіся, сталі сьведкамі таго, як невядомыя хлопцы хацелі згвалціць дзяўчыну. Зразумела, што прайсьціміма было ня ў іх выхаваньні, і ў бойцы хлопца сьмяротна паранілі нажом.

«Крэсавяцы» сьпявалі для аўстраўчан

На запрашэньне ксяндза Юзафа прыяжджала музычная група «Крэсавяцы» зь Ліды. Яны выступілі ў Казьмадзям'янаўскім і Крыжаўзьвіжанскім касьцёлах, а таксама ў мясцовым кінатэатры. У выкананьні сем'яў Міцкевічаў і Сінкевічаў — «Крэсавяцы» менавіта сямейная група — гучалі рэлігійныя, калядныя і народныя песьні.

Мар'ян Вянгроўскі, Астравец

«Региональные ведомости» ў лідэрах

Колькасьць падпісчыкаў горацкай незалежнай газэты «Региональные ведомости» павялічылася сёлета на 372 чалавекі, агульны наклад склаў 4400 асобнікаў. Гэта дазволіла газэце стаць самым тыражным рэгіянальным друкаваным выданьнем у вобласьці.

Эдуард Брокараў, Горкі

Цьвіце дрэва жыцьця

У Галоўчынскай сярэдняй школе зацьвіло японскае «дрэва жыцьця». Кажуць, гэтая расьліна абсыпаецца кветам толькі раз на сто гадоў. Жыхары старажытнага Галоўчына разглядаюць гэта як добры знак.

Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы

Пад адным дахам

Напярэдадні новага году ў Глуску адкрылася яшчэ адна прыватная крама. Яна разьмесьцілася ў будынку райаддзелу ўнутраных спраў. Раней у гэтым памяшканьні была крама калгасу «Слаўгарадзкі». Цяпер там гандлюе прадпрымальнік А.Кіпель. На паліцах крамы «Продукты» — макарона, кансэрвы, алей, садавіна, кандытарскія вырабы і г.д. Новыя гаспадары былой калгаснай крамы ахвотна гандлявалі б таксама цыгарэтамі і алькаголем, але пры цяперашняй уладзе нават не спадзяюцца атрымаць на гэта ліцэнзію.

Ігар Кірын, Глуск

Эксклюзіўная ўстаноўка

Газатурбінная ўстаноўка ўкраінскай вытворчасьці магутнасьцю 16 мэгават запушчана на цэмэнтавым заводзе ў Касьцюковічах. Яна дасьць магчымасьць на 10% зьнізіць сабекошт прадукцыі. Усталяваньне турбіны каштавала заводу 14 млрд руб. Цяпер прадпрыемства мае магчымасьць ня толькі выпрацоўваць сваю энэргію, але і значна зьнізіць выдаткі на сушку сыравіны. Такіх турбін няма ні на адным цэмэнтавым заводзе Беларусі і Расеі. І таму касьцюковіцкая прадукцыя павысіць канкурэнтаздольнасьць, экспарт на ўсход узрасьце.

Паводле «Могилёвской правды»

Помнік вашчылаўцам

Крычаўскі выканкам узяўся вырабіць і ўсталяваць у цэнтры гораду памятны знак, прысьвечаны сялянскаму паўстаньню пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы 1740—1744 г., а таксама арганізаваць шэраг мерапрыемстваў у адукацыйных установах гораду і раёну. Гэта стала вынікам звароту да мясцовай улады каардынацыйнага камітэту грамадзкай кампаніі, актывісты якой сабралі 428 подпісаў крычаўцаў у падтрымку ідэі ўшанаваньня памяці паўстанцаў.

Кацярына Яленская, Крычаў

Помнік бабру

Бабруйскі гарвыканкам абвясьціў конкурс праектаў скульптуры сымбалю гораду — бабра. Гарвыканкам прапанаваў на выбар два месцы разьмяшчэньня скульптуры: прывакзальная плошча і пешаходная зона на вул.Сацыялістычнай.

Крадуць памяткі й ліхтары

У 2003-м годзе было ўзбуджана 15 крымінальных справаў па фактах крадзяжоў надмагільных помнікаў. Вандалы ня грэбуюць і агароджамі, столікамі, штучнымі кветкамі. У сьнежні супрацоўнікі Магілёўскага РУУС выкрылі падпольную фірму, што займалася шліфоўкай мармуру і граніту. Пры вобшуку там знайшлі 20 мармуровых плітаў, паходжаньне якіх супрацоўнікі ня здолелі патлумачыць. Не пасьпеў пачацца новы год, як магільныя «крумкачы» зноў узяліся за справу. Узбуджаныя тры крымінальныя справы. Адпаведны артыкул №247 УК прадугледжвае штраф ці пазбаўленьне волі да трох гадоў.

Алеся Чыж, Магілёў

Помнік Батуру ў Горадні

12 і 13 студзеня прастаяў ў Горадні помнік Сьцяпану Батуру. Зроблены зь сьнегу барадаты рыцар у кароне і зь мячом у руцэ быў усталяваны мясцовымі жыхарамі на пастамэнт — куб вэнтыляцыйнай шахты бамбасховішча між дамамі на вул.Падольнай. З-за постаці караля выглядаў замак з тоўстымі мурамі і абарончымі вежамі.

Месца было выбрана невыпадкова. Бо вуліца Падольная вядомая пад сёньняшняй назвай зь Сярэднявечча. А цяпер паўз яе шмат хто з гарадзенцаў ходзіць рабіць закупы на Цэнтральны рынак. Помнік спадабаўся й дзеткам нулявых і першых клясаў гарадзенскай школы №1. Дзіцячы садок, у які іх адводзяць на заняткі бацькі, знаходзіцца якраз насупраць. Каб дзеткі і іх бацькі не паблыталі караля зь Дзедам Марозам, пад постацьцю быў зроблены надпіс: «С.Баторы». На жаль, адліга не пакінула шанцаў помніку: спачатку абваліліся вежы замку, потым — муры і крыж з кароны. Але застаецца спадзяваньне, што ў хуткім часе Горадня ўсталюе сапраўдны і трывалы помнік славутаму каралю.

Дзьмітры Вінчэўскі, Горадня

Пудаўкін Мастам ня трэба

Дэпутат Мастоўскага райсавету Аляксандар Пудаўкін (ПКБ) стаў беспрацоўным. Да пачатку году дэпутат рабіў спэцыялістам першай катэгорыі аддзелу землеўпарадкаваньня райвыканкаму. Афіцыйнай падставай для звальнення стала рэарганізацыя аддзелу. Старшыня райвыканкаму Васіль Кудзеля просіць ня бачыць за скарачэньнем палітычнага грунту, бо пасадаў скарочана аж сем. Але сам дэпутат зьвязвае звальненьне з палітычнай дзейнасьцю. Ён здагадваецца, што дапёк вэртыкальшчыкам абаронай Луненскай больніцы. Плянавалася, што стацыянар на 25 ложкаў зачыніцца. З ініцыятывы Пудаўкіна сабралі 1000 подпісаў у абарону шпіталю, дык выканкам мусіў працягнуць яе работу яшчэ на пяць гадоў.

Для звальнення дэпутата патрабавалася згода райсавету. Калегі, акрамя Алеся Зарэмбюка, галасавалі, як загадана.

Паводле pahonia.promedia.by

23 студзеня пятніца

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 23.50 «Мая краіна».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05 «Самаванцы». Сэрыял.
12.10 Драма «Прыкаваны».
14.05 «На скрыжаваньнях Эўропы».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
18.05 «Маскі-шоў».
18.25 Маст. фільм «Інтэрдзяўчынка».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Спэцыяльны рэпартаж.
22.05 Маст. фільм «Апэратар».
0.05 Маст. фільм «Гэндаліна».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 «Імгненьне вечнасьці».
8.30 «Іншыя танцы».
8.35, 22.05 Сэрыял «Разьвязка пецярбурскіх тайнаў». Заключная сэрыя.
9.35 «Сьвятло далёкай зоркі. Зінові Бабій».
10.05, 18.05 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Сэрыял «Сяброў не выбіраюць».
13.20 «Тры таўстуны», «Крот і музыка». Мультфільмы.
14.10 «Час кіно».
15.05 «Настаўніцкая».
15.15 «Эх, показка, показка».
15.30 «Жаніцьба». Спэктакль Беларускага акадэмічнага тэатру імя Я.Коласа.
17.10 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
18.25 Маст. фільм «Угнаць за 60 сэкунд».
20.15 «Калыханка».
20.30 «Справы сямейныя».
23.00 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Керамін» — «Дынама» (Менск). 2-і і 3-і пэрыяды.

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе».
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт»
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: баявік «Ваяр мары».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Тэатральныя гісторыі».
10.55 «Дзікая плянэта». «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.30 Дак. фільм «Сьлед дзяцінства».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам». «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.50 «Лятучы карабель». Мультфільм.
15.15 «Маска». Мультсэрыял.
16.00 «Трывалы алавяны салдацік». Мультфільм.
16.20 «Тэма дня».
16.50 Кіно: камэдыя «Леў, які сьпіць».
18.20 «Сьвецкая кроніка».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: камэдыя «Пякельны хмарачос».
23.15 «Рэактыўны бокс».
23.40 «Навіны СНД».
23.55 Кіно: баявік «Скрасьці Кендзі».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.40 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-3»).
10.45 Сэрыял «Твінісы».
15.10 «Горад жанчын».
15.45 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Новы дзень». «Сканэр».
18.30 «Бяз тэрміну даўнасьці». «Тайны замку «Пішчала».
19.00 «Поле цудаў».
20.00 Час.
21.00 Канцэртная праграма «Вышэйшая ліга».
22.50 Баявік «Без кампрамісаў».

● РТР

7.45 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
10.50 Мусульмане.
11.00 Уся Расея.
11.15 Масква—Менск.
11.30 Калясальная гаспадарка.
11.50 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 У пошуках прыгод.
17.00 Сэрыял «Назаўсёды Джулія».
18.00 Пакой сьмеху.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Маст. фільм «Пяты элемэнт».
22.25 Маст. фільм «Ціхі амэрыканец».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Іх норавы».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Гангстэры».
22.20 Браты Клічко. Найлепшыя баі. Віталь Клічко супраць Лары Дональда.

● Эўраспорт

4.00, 16.45, 19.00, 1.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
13.45 Скелетон. Кубак сьвету.
15.15, 20.00 Біятлён. Кубак сьвету.
18.00 Бабсьлей. Кубак сьвету.
21.00 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльсу.
0.45 Навіны «Эўраспорту».

24 студзеня субота

● БТ

7.35 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.00 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.
8.25 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Доўгая дарога ў дзюнах».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.45 «Шпілька». Тэлечасопіс для жанчын.
11.15 «Адкрыты архіў».
11.40 Камэдыя «Саша-Сашанька».
13.00 «Кропка».
13.45 «Маскі-шоў».
14.10 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
15.05 Дэтэктыў «Дзякуй богу, не ў Амэрыцы».
16.40 Маст. фільм «На поўдзень ад раю, на захад ад пекла».
18.50 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.30 Маст. фільм «Дзіўныя душы».
21.20 «Вакол плянэты».
21.50 Маст. фільм «Дзеці панядзелка».
23.30 Маст. фільм «Выпускнікі».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00 Мультыклюб.
8.55 «Астравы».
9.35 Наша спадчына. «Палац губэрнатара ў Віцебску».
9.50 Камэдыя «Стары Новы год».
11.05 Здароўе.
11.30 «Ёсьць толькі міг...».
11.55 «Канёк-Гарбунок», «Салодкая казка», «Крот і яйка». Мультфільмы.
13.15 Сэрыял «Прыгоды ў забытым сьвеце».
13.40 Маст. фільм «Зорка Вэнэра».
14.55 «Настаўніцкая».
15.05 «Эх, показка, показка».
15.20 «Сьпявай, душа!».
15.45 Маст. фільм «Чырвонае і чорнае».
16.40 «Лінія жыцьця».
17.30 «Росчырк часу».
17.45 «Плошча мастацтваў».
18.10 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.00 «Рэгіён».
20.30 «Час кіно».
21.25 Драма «Дзень савы».

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта». «Сьмяротны афрыканскі тузін». Дак. фільм.
7.30 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі».
8.45 Дак. фільм. «Гораду і сьвету».
9.00 «Вялікае сьняданьне».
9.30 «З дакладных крыніц».
9.45 «СТВ-спорт».
9.55 «Рэактыўны бокс».
10.20 «Партрэт у інтэр'еры».
10.35 «Запрашаем паскардзіцца...».
10.45 «Разам».
11.15 «Тэлеафіша».
11.25, 0.45 «Бафі».
12.10 «Дзікая плянэта». «Усё пра сабак». «Аўганскі хорт».
12.40 Кіно: камэдыя «Дама з папугаем».
14.25 «Гімнастыка для хваста», «Бабуля ўдава», «А раптам атрымаецца!» Мультфільмы.
14.55 «Праект «Адлюстраваньне». «Саша+Лена». Дак. фільм.
15.55 «Усё для цябе».
16.30 Клоўн-мім тэатар «Прытворшчыкі».
18.00 Кіно: камэдыя «Містэр Мільярд».
19.30 «24 гадзіны».
20.00 «СТВ-спорт».
20.15 Кіно: драма «Клетка для трусоў».
22.00 «Вялікая музыка».
22.35 «Навіны СНД».
22.50 «Арт-хаўз». Маст. фільм «Кроў і пясок».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Мультфільм.
8.30 Грай, гармонік любы!
9.05 Слова пастыра.
9.20 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Пярэстая стужка».
11.05 Дог-шоў.
11.45 «Гармідар».
12.10 «Вялізны кракадзіл».
13.05 Праграма перадач на ўчора.
13.50 Дыснэй-клюб. «Цімон і Пумба».
14.15 Разумніцы і разумнікі.
14.55 «Бяз тэрміну даўнасьці».
15.20 «Пагутарым пра дзівосы каханьня».
16.10 «Новы дзень».
16.35 Камэдыя «Адзін дома-3».
18.20 «КВК-2003». Прэм'ер-ліга. Фінал.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.50 «Залаты грамафон».
22.50 Трылер «Павуціньне хлусьні».

● РТР

8.45 Раніцняя пошта.
9.20 «Не сумуй!».
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.15 «Іншы сьвет. Атака клонаў».
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Тры плюс два».
15.00 Кіна-гісторыі.
15.10 Камэдыя «Леві і Галіяф».
17.00 Праграма «Кубак гумару».
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Камэдыя «Кракадзіл Дандзі ў Лос-Анджэласе».
23.15 Маст. фільм «Надзвычайныя меры».

● НТВ

9.05 Кулінарны паядынак.
10.00 Кватэрнае пытаньне.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.20 «Дзікі сьвет. Стаць тхаром».
12.10 Маст. фільм «Робін і Мэрыян».
14.15 Смачныя гісторыі.
14.25 Рэклямная фішка.
15.25 «Жаночы погляд».
16.00 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл. Пачаць спачатку».
17.05 Свая гульня.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Драма «Краіна глухіх».
21.30 Маст. фільм «Алі».

● Эўраспорт

4.00, 10.45, 19.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
9.00, 16.45 Скачкі з трамплінаў. Кубак сьвету.
13.00 Бабсьлей. Кубак сьвету.
14.00 Горныя іртыі. Кубак сьвету.
15.15 Біятлён. Кубак сьвету.
18.30 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
20.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
22.30, 0.45 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльсу.
23.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Манака.
0.00 Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.

25 студзеня нядзеля

0.30 Навіны «Эўраспорту».

● БТ

7.35 «Сузор'е надзей». II Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.00 «Любы капрыз».
8.30 «Арсэнал».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Доўгая дарога ў дзюнах».
10.00 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
10.50 Падарожжа дылетанта. «Мястэчка Сьмілавічы. Сьмілавіцкае графства».
11.20 Камэдыя «Двое пад адным парасонам».
12.55 «Чэмпіёны».
13.10 Тэлеклюб «Ваша лято».
13.50 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
14.40 Маст. фільм «Адступнік».
17.00 «На скрыжаваньнях Эўропы».
17.40 Маст. фільм «Сваякі».
19.20 Маст. фільм «Хлопец зь Белай Ракі».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Прафэсійны бокс. Відэаагляд.
22.45 Маст. фільм «Пасланец каралевы».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00 Мультыклюб.
8.55 «Не зявай!».
9.35 «Пра бегемота, які баяўся прышчэпак», «Казкі крышталёвага шарыка». Мультфільмы.
9.55 «Мір вашаму дому».
10.10 Маст. фільм «Стары Новы год».
11.15 «Сад мары».
11.40 Дак. фільм «Ахоўнікі прыроды».
12.05 «Царэўна-жабка». Мультфільм.
12.45 Сэрыяд «Прыгоды ў забытым сьвеце».
13.10 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі».
14.35 «Сьмеханастальгія».
15.00 Правінцыйныя гісторыі.
15.25 «Сьвятло далёкай зоркі. Юры Ступакоў».
15.50 Дак. сэрыял «Сцэнары мастацтва».
16.20 «Сфэры».
17.00 «Імгненьне вечнасьці».
17.20 Плошча мастацтваў.
17.45 «Сіла прыцягненьня».
18.10 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.00 Навіны.
20.10 Тэлебаромэтар.
20.25 «Справы сямейныя».
21.35 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру. Жывая трансьляцыя з Італіі.

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта». «Пума, валадарка Андаў». Дак. фільм.
7.30 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася».
8.20 «Бітлборгі».
8.45 «Казачны прынц». 1-я сэрыя.
9.40 «СТВ-спорт».
9.55 «Аўтапанарама».
10.20 «Менск і менчукі».
10.30 «Вялікае сьняданьне».
11.00 «Сьвецкая кроніка».
11.10 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.25 «Пульс плянэты». «Міжнародны агляд».
11.45, 23.45 «Бафі».
12.30 «Добры дзень, доктар!»
12.50 «Кіно». Маст. фільм «Дамскае танга».
14.50 «38 папугаяў», «Куды ідзе сланяня?» Мультфільмы.
15.10 «Найлепшыя шоў сьвету».
16.10 Кіно: маст. фільм «Дзідзье».
18.00 «Дом, які пабудую я».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Душой выкананы палёт». Балет «Страсьці» («Рагнеда»)
19.40 «Асабістыі інтэрас».
20.20 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.55 «Аўтапанарама».
21.20 «Турпаход».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: драма «Аднойчы ў Амэрыцы».
1.30 «Навіны СНД».

● АНТ

8.00 «Твінісы».
8.20 Мультфільм.
8.30 Служу Айчыне!
8.55 Дыснэй-клюб. «Геркулес».
9.20 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.00 «Угадай мэлёдыю».
11.30 «Падарожжы натураліста».
12.10 Камэдыя «Скрыжаваньне».
13.55 Дыснэй-клюб. «Мікі Маўс і яго сябры».
14.20 Ток-шоў «Выбар».
15.00 «Дачнікі».
15.45 Сьмехапанарама.
16.15 Камэдыя «Калі Гары сустрэў Салі».
17.50 «Жывёлы на мяжы».
18.50 Камэдыя «Канвалія серабрыстая».
20.30 Контуры.
21.15 Маст. фільм «Жанна д'Арк».
23.50 «Біітлз» у мультыплікацыйным фільме «Жоўты падводны човен».

● РТР

9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Банзай».
15.25 Пакой сьмеху.
16.25 Маст. фільм «Зоркавыя войны». Эпізод IV. «Новая надзея».
18.50 «У Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.00 Маст. фільм «Расплата».
22.00 Маст. фільм «Шызафрэнія».

● НТВ

8.30 Дэтэктыў «Чыстая старонка».
10.25 Вайсковая справа.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.15 «Аранжыкавы сок».
11.45 «Увага: вышук».
12.20 Маст. фільм «Кароткія сустрэчы».
14.15 «Іх норавы».
15.20 Сабакава жыцьцё.
15.50 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл. Пачаць спачатку».
17.00 Свая гульня.
17.50 Маст. фільм «Асінае жыцьцё».
20.00 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
21.30 Маст. фільм «Доні Браска — стукач».

● Эўраспорт

4.00, 14.15, 19.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
9.30, 16.00 Скачкі з трамплінаў. Кубак сьвету.
11.00, 13.00 Бабсьлей. Кубак сьвету.
12.00, 15.15 Біятлён. Кубак сьвету.
12.45, 14.00 Горныя іртыі. Кубак сьвету.
17.30, 22.00 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльсу.
20.00, 0.45 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
23.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Манака.
0.00 Ралі. Ралі Рэйд Дакар.
0.30 Навіны «Эўраспорту».

праграма ТВ з 23 да 29 студзеня

26 студзеня панядзелак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.30, 8.30 «Дзелавое жыцьцё».
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.05 «36,6».
10.30 Падарожжа дылетанта. «Мястэчка Сымілавічы. Сымілавіцкае графства».
11.05 «Шпілька».
11.35 «Сузор'е надзеі». II Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
12.10 Спэцыяльны рэпартаж.
12.25 Маст. фільм «Двое пад адным парасонам».
14.05 Тэлеклюб «Ваша лято».
14.45 «Мая краіна».
15.10 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
17.05 «Між іншага...».
18.05 «Самазванцы-2». Сэрыял.
19.05 Зона Ікс.
19.15 Маст. фільм «Сусьветны рэкорд».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Памяці Ўладзімера Мулявіна. «Гучаньне жыцьця». Відэафільм.
22.40 Маст. фільм «Раскіданае гняздо».
0.05 «Час спорту».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Правінцыйныя гісторыі.
8.35 Сэрыял «Разьвязка пецярбурскіх тайнаў». Заключная сэрыя.
9.35 Наша спадчына. «Палац губэрнатара ў Віцебску». Частка 1-я.
9.45 Тэлебаромэтар.
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.25, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 13.00 «Звычайны незвычайны дзень».
11.45 Маст. фільм «Зорка Вэнэра».
13.25 «Песьняры» на «Залатым шлягеры-99».
14.10 Сэрыял «Касыяпэя».
14.35 «Вясёлы агарод», «Сёньня ў нашым горадзе». Мультфільмы.
14.55 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.20 «Не зявай!».
15.30 «Бум».
16.00 «Памінальная малітва». Спэктакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатру імя Я.Купалы.
18.50 Камэдыя «Ясь і Яніна».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
22.05 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік туру.

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30 «168 гадзін».
8.20 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: камэдыя «Пякельны хмарачос».
10.20 «Асабісты інтэрас».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Новыя заваеднікі». Дак. фільм.
11.30 «З дакладных крыніц».
11.45 «Тэлеафіша».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.45 «ОБЖ, ці Лад жыцьця». Тэлесэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Васіліса прыгожая». Мультфільм.
16.20 «Турпаход».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
20.00 «СТВ-спорт».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Кадравае пытаньне».
20.55 Кіно: маст. фільм «Кідалы і гангстэры».
23.15 «Сталічны футбол на Кубку Садружнасьці».
23.40 «Навіны СНД».
23.55 Кіно: камэдыя «Эльвіра, валадарка цемры».
1.25 «Вялікая музыка».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.40 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.50 Маст. фільм «Жанна Д'Арк».
12.25 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
14.25 Маст. фільм «Маэстра злодзей».
15.40 Сэрыял «Берагі мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Чакай мяне.
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.40 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
22.50 Маст. фільм «Клетка для птушак».

● РТР

7.45 Маст. фільм «Расплата».
9.40 «У Гарадку».
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовая частка. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50 Весткі тыдня.
16.10 Маст. фільм «Кобра. Груз».
17.00 Маст. фільм «Спас пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Дзівацтвы Алісы».
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
22.00 Весткі+.
22.20 «Мой срэбраны шар».
23.30 Маст. фільм «Лавэлас».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Надоечы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35, 22.50 Дэтэктыў «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 Сэрыял «Бязь сьледу».

● Эўраспорт

4.00, 17.00, 19.00, 1.00, 2.00 Тэніс. Адкрытыя чэмпіянат Аўстраліі.
15.00, 20.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
22.00 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.
23.15 Футбол. Эўрагалы.
0.15 Мультыспорт. Госьць тыдня.
0.30 Навіны «Эўраспорту».
0.45 Алімпійскія гульні. Культурная праграма Алімпіяды.

27 студзеня аўторак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 23.25 «Мая краіна».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05, 18.05 «Самазванцы-2». Сэрыял.
12.10 «Зона Ікс».
12.25 Камэдыя «Сусьветны рэкорд».
14.05 «Усё нармальна, мама!».
15.10 «Час спорту».
15.35 «Маскі-шоў».
16.05 «5х5».
19.10 Камэдыя «Найлепшы сябар».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Маст. фільм «Дзіўны час».
23.40 «Любы капрыз».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 «Ёсьць толькі міг…».
8.35 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік туру.
9.40 «Сьлявай, душа!».
10.10, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.25, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.50 «Звычайны незвычайны дзень».
11.45 Камэдыя «Ясь і Яніна».
13.15 Дак. фільм «Дагарае вечар чалавечага жыцьця».
13.45 «Як шчаня вучылася плаваць», «Шарык-ліхтарык». Мультфільмы.
14.10 «Не зявай!».
14.50 «Шэсьць Іванаў — шэсьць капітанаў». Мультфільм.
15.05 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.30 «Не зявай!».
15.40 «Бум».
16.05 «Невядомы Напалеон». Дак. сэрыял. «Пачатак».
16.30 «У плыні жыцьця». Народны пісьменьнік Беларусі Іван Шамякін.
17.10 «Настальжы». «Кароль джазавых віртуозаў». Эдзі Рознэр.
17.40 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
18.50 Сэрыял «Крах інжынэра Гарына».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».

● СТВ

7.00 «Пэрсэй», «Пясочны гадзіньнік». Мультфільмы.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.15, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.30, 23.35 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: трылер «Кідалы і гангстэры».
10.10 «Сталічны футбол на Кубку Садружнасьці».
10.35 «Запрашаем паскардзіцца...».
10.50 «Пакуль гарыць сьвечка».
11.20 Кіно: трылер «Зьмеялоў».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Золата інкаў». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.45 «ОБЖ, ці Зачараваныя жыцьцём». Тэлесэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
16.00 «Як кот з мышамі ваяваў». Мультфільм.
16.15 «Кадравае пытаньне».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.15 «Добры дзень, доктар!».
20.00 «СТВ-спорт».
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Закон і крымінал».
20.55 Кіно: баявік «Зацяжны скачок».
23.05 «Гарачы лёд».
23.45 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: камэдыя «Эльвіра, валадарка цемры-2».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.30 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.45 Дыснэй-клюб: «Кім Пяць-з-плюсам».
14.25 Дэтэктыў «Двайны ўдар».
15.40 Сэрыял «Берагі мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Тэорыя неймавернасьці. «Гадзіны жыцьця».
18.40 «Засталася адна Таня». Дак. фільм.
20.00 Час.
21.00 Маст. фільм «Порах».
23.40 «Ня толькі пра футбол».
0.00 «На футболе».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовая частка. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Маст. фільм «Кобра. Груз».
17.00 Маст. фільм «Спас пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Дзівацтвы Алісы».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Тайны блякладнага гораду».
23.30 Маст. фільм «Паставыя».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Невядомая вайна: блякада Ленінграду.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35, 22.45 Дэтэктыў «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 Сэрыял «Бязь сьледу».

● Эўраспорт

4.00, 7.45, 10.30, 17.00, 21.00, 1.00, 2.00 Тэніс. Адкрытыя чэмпіянат Аўстраліі.
15.00, 19.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
22.00 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.
0.00 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
0.30 Навіны «Эўраспорту».
0.45 Мультыспорт. Усялякая ўсячына.

28 студзеня серада

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05, 18.05 «Самазванцы-2». Сэрыял.
12.10 Маст. фільм «Найлепшы сябар».
14.05 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
14.45 «Мая краіна».
15.10 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
19.10 Спэцыяльны рэпартаж.
19.20 Маст. фільм «Гарачыя навіны».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Камэдыя «Даўн хаўз».
23.20 «Чэмпіёны».

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Плошча мастацтваў. «Джаз-трыё Аркадзя Эскіна».
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.25 «Не зявай!».
15.35 «Бум».
16.05 «Невядомы Напалеон». Дак. сэрыял. «Пачатак».
16.25 «Творцы». Народны артыст Беларусі Канстанцін Саньнікаў.
17.20 «Росчырк часу».
17.35 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
18.50 Сэрыял «Крах інжынэра Гарына».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».

● СТВ

6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: баявік «Зацяжны скачок».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Закон і крымінал».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Новыя заваеднікі». Дак. фільм.
11.30 «Гарачы лёд».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Золата інкаў». Дак. фільм.
13.50 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.45 «ОБЖ, ці Ён быў чужым». Тэлесэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Дом, які пабудаваў я».
16.20 «Тэма дня».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.15 «Плянэта людзей».
18.30 «Клетка». Тэлесэрыял.
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: камэдыя «Карабель дурняў».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Праект «Адлюстраваньне»: «Апошні палёт». Дак. фільм.
0.00 «Люзіён»: Маст. фільм «Запіска».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50, 21.55 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.45 «Ня толькі пра футбол».
11.05 Дыснэй-клюб: «Цуды на віражах».
14.55 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.40 Сэрыял «Берагі мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Ген даўгалецьця». Дак. фільм.
18.40 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
23.05 Камэдыя «Горш не бывае».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45, 22.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовая частка. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Маст. фільм «Кобра. Груз».
17.00 Маст. фільм «Спас пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Жаночыя сьлёзы».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Бяз гальштука».
23.05 Камэдыя «Шуб-баба Люба!».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Кулінарны паядынак.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35, 22.50 Дэтэктыў «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 Сэрыял «Бязь сьледу».

● Эўраспорт

4.00, 7.30, 10.30, 19.15, 1.00, 2.00 Адкрытыя чэмпіянат Аўстраліі.
15.00, 17.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
20.15, 21.15 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Манака.
21.30 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.
23.15 Конны спорт. Кубак сьвету ў Нямеччыне.
0.15 Алімпійскія гульні. Алімпійскі часопіс.
0.45 Навіны «Эўраспорту».

29 студзеня чацьвер

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 0.05 «Мая краіна».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.10, 18.05 «Самазванцы-2». Сэрыял.
12.20 Дэтэктыў «Гарачыя навіны».
14.05 «Кропка».
15.10 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
19.10 Драма «Мой сябар Іван Лапшын».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 «Правы чалавека. Погляд у сьвет».
22.00 Маст. фільм «Экспэрымэнт».
0.20 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.

● ЛАД

6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Плошча мастацтваў.
8.35, 22.05 Сэрыял «Пракляты ўтульны дом».
9.35 «Здароўе».
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50, 18.50 Сэрыял «Крах інжынэра Гарына».
13.25 «Бабулін козьлік», «Храбры заяц». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.00 Сэрыял «Люстра, люстры».
15.25 «Не зявай!».
15.35 «Бум».
16.05 «Болек і Лёлек: Палёт», «Хворы зуб». Мультфільмы.
16.25 «Невядомы Напалеон». Дак. сэрыял. «Бліскавіца Італіі».
17.00 «Вечар з Аляксандрам Каліноўскім». Музычная праграма.
17.40 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

● СТВ

6.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50, 15.40 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Сьвецкая кроніка».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: камэдыя «Карабель дурняў».
10.20 «Партрэт у інтэр'еры».
10.40, 20.40 «Фільм, фільм, фільм».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Новыя заваеднікі». Дак. фільм.
11.30 «Праект «Адлюстраваньне»: «Апошні палёт». Дак. фільм.
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам»: «Вялікая рака амазонак». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 «ОБЖ, ці Кастрычнік Бледна-Жоўты». Тэлесэрыял.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Чароўны пярсьцёнак». Мультфільм.
16.20 «Запрашаем паскардзіцца...».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.15 «Тэатральныя гісторыі».
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: драма «Інтымныя паслугі».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Душой напоўнены палёт». Балет «Страсьці» («Рагнеда»).
0.05 Кіно: трылер «Джоні-прыгажун».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50, 21.55 Сэрыял «Наступны» («Next-3»).
10.45 «На лініі агню». Фільм 1-ы.
11.10 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
14.45 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.40 Сэрыял «Берагі мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Зоркі этэру».
18.40 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Слабое зьвяно».
23.05 Баявік «Сьмяротная бітва. Зьнішчэньне».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Маст. фільм «Кобра. Антытэрор». «Князь цемры».
17.00 Маст. фільм «Спас пад бярозамі».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Жаночыя сьлёзы».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Гістарычныя хронікі».
23.30 Маст. фільм «Разам».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Кватэрнае пытаньне.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Пратакол.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35, 22.50 Дэтэктыў «Мангуст». Заключная сэрыя.
19.50 Сэрыял «Таксістка». Заключная сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Да бар'еру!».

● Эўраспорт

4.00, 8.30, 10.30, 12.30, 14.30, 19.30, 0.15 Тэніс. Адкрытыя чэмпіянат Аўстраліі.
16.30 Іртавае двазбор'е. Кубак сьвету ў Японіі.
17.30, 20.00 Футбол. Афрыканскі Кубак Нацый.
22.00 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.
0.00 Навіны «Эўраспорту».
1.15, 2.15 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Манака.

Прапануйце словы

Як па-беларуску «разэтка»? А «вілка»? А «аддзелачныя матэрыялы»? Каб наша мова жыла рэаліямі свайго часу, каб яе цела не замянялася пратэзамі, ствараць новыя словы павінны ня толькі пісьменьнікі, але і яе звычайныя носьбіты.

Большае вакол нас цывілізацыйных выгодаў, адпаведна расьце і колькасьць запазычаных словаў у беларускай мове. Такая «недаасвоеная лексыка» кожнаму зразумелая, але яна не спрыяе разьвіцьцю мовы, а часам і бурыць яе лад. У некаторых краінах пра ўзбагачэньне і чысьцінню мовы дбаюць дзяржаўныя інстытуты. Напрыклад, Французская акадэмія распрацоўвае для новых прадметаў і зьяваў французкія найменьні, а за ўжываньне запазычаньняў замест сваіх адпаведнікаў караюць. Бо — трэба мець сваё. Мова — гэта традыцыя, якая павінна быць багатаю, каб ня трапіць у музэй. Інакш абавязкова знойдзецца нейкі чмут, які скажа, што на ёй «нельга выказаць усяго».

Суседзі Беларусі таксама ня сьпяць у шапку. У Эстоніі конкурсы наватвораў праводзяцца з 60-х. У Польшчы велізарны конкурс ладзіла «Газэта Выборча». Высьвятлялі, да прыкладу, як па-польску можна назваць сэкс-шоп. У выніку польскія, эстонскія ці французкія словы ўводзяцца ў кампутар, у мабільнік, у войска. Гэтыя мовы ўнікаюць калек кшталту «файл» або «роўмінг». Маватварэньне адбываецца паралельна з разьвіцьцём нацыі, яно творча супрацьстаіць культурнай агрэсіі.

Другая палова XX ст. была ў беларускай мове бедная на наватворы. Лінгвіст Сяргей Шупа выводзіць гэта зь непаўнакроўнасьці жыцьця беларускай мовы, якую не падпускалі да выкананьня шматлікіх функцыяў. Аўтаматычна пераносіліся ў беларускую мову расейскія назвы новых прадметаў і тэхналёгій. У іх ЭВМ, і ў нас ЭВМ. Дастаткова зірнуць на архітэктурную і будаўнічую тэрміналёгію, каб зразумець, наколькі гэта нявечыць мэлёдыку мовы, рэжа слых, не натуралізуецца. Да XX ст. мова стварыла або прыцёрла, да прыкладу, «крокву», «столь», «масьніцу», «скляпеньні», а пасьля вайны пакацілася: «убудаваныя шафы», «пляніроўка», «буйнапанэльны».

Усё гэта і заахвоціла «НН» распачаць у 2000 г. першую кампанію пошуку заменьнікаў або наватвораў для «пратэзных» словаў, у спадзеве, што XXI ст. будзе для беларускай мовы шчодрым на наватворы і моваабнаўленьне. Вацлаў Заякоць у «НН» за 16 студзеня абвясьціў сярод чытачоў чарговую талаку: «Як называць «аддзелачныя» матэрыялы». Падобныя абмеркаваньні мінулых гадоў унесьлі новыя словы як у жывую мову чытачоў «НН», так і ў будучыя слоўнікі. Спадары і спадарыні, філёлягі і электрыкі, прадпрымальнікі і прадаўцы, прапануйце, калі ласка, яскравыя беларускія адпаведнікі словаў. Прыйшоў ужо першы водгук, зь якім мы вас знаёмім. Чакаем новых прапановаў.

Тычка, лычка, дамок

Як у «кавы» з «гарбатай», як у «солі» з «цукрам», як у «коткі» з «сабакам», гэтаксама ў «вілкі» з «разэткай» неразьлітая вада. У нашых разумовых схемах, вядома. Хай па-беларуску «вілка» і «разэтка» будзе «тычка» і «лычка». Сказаў «лычка», а падумаў «ды тычка». Уявіў «тычку», а ў мазгу пульсуе словам ды вобразам «лычка». Яны — інь і янь электрыфікацыі Беларусі, ці, калі жадаеце, беларусіфікацыі электрыкі.

«Тычка» — таму што «тыцкаць». Напрыклад, тыцкаць пальцамі ў сала. Дык — тыцкаць тычку. А «лычка» — бо на сьвінячы лыч падобная. Кругленькая, зь дзьвюма дзюрачкамі — лыч дый годзе! Але ж усё-ткі наш лыч не сьвінячы, а электрычны. А дзе электрычнасьць, там далікатнае абыходжаньне патрэбна. Таму ня «лыч», а «лычка». Да таго ж, хто гэта будзе трымаць сьвіньню ў хаце, хіба што сьвінку.

Што за рэч — лямпачка без электрычнасьці! Пустая шклянка. Сумна ёй, беспрытульнай, як пазбаўленай роднай хаткі. Бо сапраўднае прызначэньне лямпачкі — гарэць, сьвятло прыносіць. Ды дзе ты будзеш гарэць без электрычнасьці! Укручваючы лямпачку ў «дамок», мы вяртаем яе да месца прызначэньня, дадому-дахаты. ...І напоўнілася маленькая лямпачка сьвятлом. Радая, што вярнулася ў «дамок». Тыцкайце ж тычку ў лычку, а лямпачку ўкручвайце ў дамок!

Павал Касьцюкевіч, Менск

Яшчэ пра Барысенку, Чорнага і Букчына

Прачытала ў «НН» ад 9 студзеня артыкул «Юбілеі 2004». У ім згадваецца Васіль Барысенка, якому 25 красавіка споўніцца сто гадоў. Аўтар піша, што з 1937 г. ён узначальваў Інстытут літаратуры. «Пры Барысенку сотні беларускіх літаратураў былі расстраляныя і высланыя». А ці ёсьць у гэтым віна сп.Барысенкі? Гэтак агулам можна абвінаваціць усіх, хто жыў у тыя часы. Мая мама працавала машыністкай у Інстытуце літаратуры з 1946 г., да гэтага — у дзяржвыдавецтве, да вайны — у «ЛіМе», таму я добра ведала шмат каго зь пісьменьнікаў, добра ведала і Васіля Барысенку. Я памятаю, як ён уладкоўваў на працу родных рэпрэсаваных пісьменьнікаў, напрыклад, у тыя часы там працавала дачка Цішкі Гартнага, сваяк аднаго з Гарэцкіх.

Вакол Барысенкі ўсе нешта перашэптваліся, нешта недагаворвалі. Я тады была дзяўчынкай, нічога ня ведала і не разумела, ад мяне ўсё ўтойвалі, але ж я памятаю, што мой бацька таксама быў рэпрэсаваны праз сваіх братоў, Антона і Эдуарда Барткевічаў. Лёс іх мне невядомы — напэўна, загінулі ў Курапатах. А бацька летам 1941 г. быў рэабілітаваны і з 22 чэрвеня быў у Чырвоным войску, на фронце — аж да вясны 1946 г. Паўтараю, ад мяне ўсё скрывалі. Але ж у дзяцей «слых за семярых», яны шмат чаго ўлоўліваюць і запамінаюць. Напрыклад, я добра памятаю, як удава Цішкі Гартнага мне казала, што яе муж ні ў чым не вінаваты і ўся праўда аб ім стане вядомай.

Гады ідуць, шмат што забываецца, адыходзяць з жыцьця сьведкі тых далёкіх падзеяў, і на памяць тых сьведкаў ня вельмі можна спадзявацца. Вось у «Народнай Волі» ад 5.11.2003 быў артыкул Міхася Тычыны пра ўспаміны пэнсіянэркі сп.Градзітар («З Кузьмом Чорным — скрозь вогненны Менск» — **Рэд.**). Мяне ён вельмі ўсхваляваў: ня ўсё там адпавядае рэчаіснасьці. Я добра памятаю, як Кузьма Чорны 24 чэрвеня 1941 г. у натоўпе пісьменьнікаў нёс мяне на руках. Летам 1941 г. я адпачывала ў доме адпачынку пісьменьнікаў у Мар'інай Горцы. 22 чэрвеня мама забрала мяне адтуль дадому. 23 чэрвеня яна ўзяла мяне з сабой на працу ў Саюз пісьменьнікаў на вул. Камсамольскай (на рагу з Савецкай). Тады па радыё заклікалі ўсіх захоўваць спакой і ісьці на працу. Але немцы так моцна бамбілі горад, што дамоў, на вул. Маскоўскую, вярнуцца мы не маглі, і ўсе супрацоўнікі і пісьменьнікі начавалі ў падвале суседняга дому. А 24 чэрвеня пайшлі з гораду ў бок Краснага Ўрочыча (цяпер пасёлак Аўтазаводу, а да вайны гэта быў Вайсковы гарадок). Там у гэты час быў бой паміж чырвоناармейцамі і нямецкімі дэсантнікамі. Неяк мы выбраліся адтуль і накіраваліся на ўсход па Магілёўскай шашы. Я вельмі прытамілася, і Кузьма Чорны ўзяў мяне на рукі. Як ён мог у гэты самы час быць ва Ўруччы, я зразумець не магу. Спадарыня Градзітар нешта забыла ці пераблытала.

Але хопіць аб мінулым, хоць можна было б шмат чаго напісаць.

Хачу сказаць, што я цалкам падтрымліваю пазыцыю «НН» у палеміцы з Букчыным. Ён мае права выкладаць свае думкі і меркаваньні, але ня гэткім мэнтарскім тонам, так звысоку, непаважліва да апанэнтаў.

Што тычыцца прапановаў сп.Лабановіча, то я больш згодна з пазыцыяй сп.Бухвостава. Калі вядомая ўсім асоба і імкнецца захаваць (хутчэй за ўсё на словах) незалежнасьць краіны, дык гэта імкненьне захаваць уладу. Дый што гэта будзе пры яго дыктатуры за незалежная краіна — без нацыянальнай мовы, нацыянальнай культуры, пры сфальсыфікаванай гісторыі, марыянэткавым парлямэнце, паслухмяных судах і г.д. Я — за незалежнасьць, але супраць дыктатуры.

Інэса Касьцюк, Менск

Праграма для селядцоў

Згодна зь лёгікай Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі, адсутнасьць праграмы тэлепередачаў у незалежных газэтах павінна скараціць ім колькасьць чытачоў. (Як жа хочацца, каб у суседа карова здохла!) А калі чытачы ня будуць мець праграмы, ці скароціць гэта колькасьць тэлеглядачоў?

Паталягічная зацікаўленасьць беларусаў у наяўнасьці праграмы ў газэтах зьдзіўляе. Бо на самай справе гэтай праграмай мы ня так ужо часта і карыстаемся, і, па вялікім рахунку, не патрэбна яна нам зусім. Па звычцы, па інэрцыі яе людзі пытаюць ці што?

На сучаснае тэлебачаньне людзі плююцца, хоць пры адсутнасьці лепшага працягваюць глядзець. Але як? З маіх назіраньняў, нармальныя працоўныя людзі ўвечары глядзяць тэлевізар ня згодна з праграмай, а тады, калі вызваляцца ад хатніх справаў. Пашчоўкаюць пераключальнікам, стомлена плюхнуўшыся на канапу, і спыняцца на канале, які іх больш зацікавіць. Ці калі тэлевізар стаіць на кухні, пад яго сьнедаюць і вячэраюць, зьбіраюцца на працу ці робяць хатнія справы. Ну і навошта ім праграма пры такім раскладзе? Таму ўвага да праграмы ў газэце перабольшаная.

Мне здаецца, што адсутнасьць праграмы на чытацкую аўдыторыю «НН» не паўплывае. І няхай сабе тэлерадыёкампанія загортвае ў сваю нецікавую праграму свае бутэрброды на сьняданак.

Таіса Мішчанка, Масква

Тэхніка ў быце

На «Тэхніцы ў быце» нарэшце павесілі пісьменную вывеску. З 96-га краму ўпрыгожвалі безгустоўна-ружовыя літары «Тэхніка у быту». Фірмаў, якія займаюцца вонкавай рэклямай, паводле даведніка «Бізнэс-Беларусь», у краіне ня больш за пару сотняў. Чаму б ТБМ не разасласць ім інфармацыйны ліст ды раз і назаўжды не патлумачыць, што «Ё» нельга замяняць на «Е», а «У» ніяк ня тое самае, што «Ў».

Праз тое ня ведаеш, ці радавацца якому-небудзь беларускаму надпісу, хаця здараюцца і сьмешныя бязглузьдзіцы, як, напрыклад, шыльда над павільёнам ля к/т «Вільня» ў Менску — «УСЕ З МЯСА».

Вацлаў Заякоць

Хай НДІ спаборнічаюць у іншым

Цікавую нататку «За легалізацыю допінгу» зьмясьціў сп.Казлоўскі ў «НН» №1. У ёй гаворыцца, што допінг варта легалізаваць. Аднак варта разглядаць дадзенае пытаньне і з пункту погляду нацыянальных інтарэсаў. Легалізацыя допінгу прывядзе да таго, што нашыя спартоўцы ня будуць мець шанцаў на міжнароднай арэне. Бо нашыя фармаколягі даўно адсталі ад плянэты ўсёй. Нездарма ж яны выкарыстоўваюць у сваёй працы мэдпрэпараты, якія зь лёгкасьцю выяўляюць сучасныя допінг-тэсты.

Спорт павінен заставацца чыстым ад каляспартовых жарсьцяў. Навуковыя лябараторыі і НДІ павінны абрацьць для сябе іншую арэну спаборніцтваў, а не спартовую.

Пачынальнік сучаснага алімпійскага руху П'ер дэ Кубэртэн пісаў у сваёй «Одзе спорту»: «О, спорт, ты прыгажосьць! Ты архітэктар гэтага будынку чалавечага цела, якое можа стаць убогім або велічна прыгожым, у залежнасьці ад таго, ці яно будзе зганьбаванае нізкімі жарсьцямі, ці клапатліва выпешчанае здаровымі памкненьнямі».

Спрэчка аб допінгу ў спорце пакуль не прыйшла да лягічнага рашэньня, як ня знойдзены адназначны адказ у пытаньнях абортаў, аднаполых шлюбаў, эўтаназіі, адкрытага продажу наркотыкаў, стаўленьня да рэжыму etc. У кожнага тут свая праўда.

А чалавекам году асабіста для сябе я абраў Макса Мірнага, дзякуючы якому пра Беларусь дазнаюцца тысячы людзей ва ўсім сьвеце. Тым болей ёсьць нагода — выхад тэніснай зборнай у Кубак Дэвіса. Посьпехаў, хлопцы!

Зьміцер Панкавец, Кастрыца (Барысаўшчына)

PHOTO.BYMEDIA.NET

Максім Мірны

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваньня допісаў. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць допісы поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

Хто падвядзе «тлустую рысу»

Працяг са старонкі 1.

Ю.Д.: Спадару Букчын, Вы пішаце ў сваім артыкуле, што ідэя «тлустай рысы» пад мінулым фактычна запазычаная ў палякаў, яна — частка філязофіі знакамітага «круглага стала» апазыцыі і ўлады. Польская апазыцыя пайшла тады на тое, каб шмат што дараваць. І справа, дарэчы, зусім ня ў гэтым — дараваць — не дараваць, а ў тым, што тады бакі, ворагі, дамовіліся пра правілы гульні. Можна прыгадаць яшчэ больш раньні прыклад — «пакт Монклаа», які гішпанскія франкісты і антыфранкісты заключылі пасьля сьмерці дыктатара. Пры гэтым на сумленьні польскіх камуністаў і гішпанскіх франкістаў было ня менш, чым на сумленьні лукашэнкаўцаў. Ёсьць і айчынны досьвед — дыялёг паміж уладай і апазыцыяй пра правілы палітычнай барацьбы, які ў 1999—2000 гадох спрабаваў наладзіць кіраўнік місіі АБСЭ Ганс-Георг Вік. Значыць, Дынько — кепскі. А Валэнса, які пагадзіўся сесьці зь Яруэзэльскім за «круглы стол», — добры? І пасол Вік — таксама добры? Ці ўсе яны кепскія, усе — калябаранты?

Сямён Букчын: Я не палітык, я — пісьменьнік. Я трымаюся запавету Чэхава заўсёды быць на баку пакрыўджаных. І я ўпэўнены: прапанова «НН» — амаральная. Хаця можна зразумець, што рэдактар Дынько шукае шляхоў выхаду з таго замкнёнага кола, у якім апынулася Беларусь. Але трэба гаварыць пра гэта адкрыта. Калі ты гаворыш пра «тлустую рысу», то давай падлічым, што маецца на ўвазе. Гэта працяг старой спрэчкі пра «сьлязінку дзіцяці».

Андрэй Дынько: Ня можа быць дэмакратыі ў Паўночна-Заходнім краі Расеі. Як і ня можа быць такога, што мы незалежнай краінай увойдзем у Эўразьвяз і пры гэтым у нас застанецца безальтэрнатыўны парлямэнт.

Ю.Д.: Вы гаворыце пра маральныя прынцыпы. А яны, як вядома, маюць унівэрсальны характар. Сп. Дынько са сваімі прапановамі, на Ваш погляд, амаральны. А Валэнса ў 1989 г. быў амаральным? Вік у 1999 годзе быў амаральным?

С.Б.: Сёньня ў Польшчы ідзе гарачая палеміка наконт вынікаў «круглага стала». Не была асуджаная камуністычная ідэалёгія, ня быў асуджаны рэжым, шмат на што былі заплюшчаныя вочы, і з гэтага нарадзіліся балючыя праблемы цяперашняга польскага грамадзтва. Справа не ідзе пра тое, што нехта заклікае да гвалту, а нехта стаіць за кампраміс. Я таксама не за гвалт, я хачу гэта падкрэсьліць.

Пэўная нацыянальная абмежаванасьць некаторых аўтараў «НН» зьвязаная, прабачце, з пэўным узроўнем палітычнай, філязофскай і чалавечай культуры. Тут далучаецца і іншая праблема: што першаснае — правы чалавека ці нацыянальныя інтарэсы.

Ю.Д.: У адрозьненьне ад сп.Букчына, я ня буду вучыць Вас, сп.Дынько, маралі, але хачу зьвярнуць увагу на адзін практычны момант. Ваш апанэнт заканчвае свой артыкул словамі: «Гаспадар заўсёды ўкажа месца «шасьцёрцы» — каля парашы». Гэта, безумоўна, груба, але прыгадваецца інтэлектуальны кручок, на які чэкісты лавілі дзеячоў БНР. Маўляў, эміграцыя, падпольле — месца для пацукоў, а трэба далучацца да будаўніцтва рэальнай Беларусі. Праўда, улада ў гэтай рэальнай Беларусі іншая, чым вам хацелася б, але ж вы зможаце працаваць, пераконваць гэтую ўладу. І шмат хто папаўся на гэты кручок і патрапіў урэшце нават не да парашы, а ў Курапаты. Калі не кранаць гістарычных ценяў, можна паглядзець крыху бліжэй. Я ўяўляю сабе, як Урал Латыпаў патэлефанаваў пасьля выхаду нумару Вашай газэты Паўлу Якубовічу і, пасьміхаючыся, сказаў: «Малайчына, Паша. Каб твае опусы друкавала газэта, якую Гавал уганараваў як флягмана беларускай дэмакратыі, і прычым друкавала бяз грошай, без шантажу — гэта супэр!» Магчыма, Вас проста «разьвялі», як «разводзілі» чэкісты ў 20—30 гадох дзеячоў тагачаснага Адраджэньня?

А.Д.: Паралель з 20-мі гадамі некарэктная. Тады Беларусь была частка Савецкага Саюзу. Цяпер мы маем сваю незалежную дзяржаву. Як любіць паўтараць адзін наш палітык, хочаце вы гэтага ці ня хочаце, але гэта факт.

Я лічу вартымі абдумваньня меркаваньні, якія выказаў на старонках «Народнай волі» палітык з АГП Яўген Лабановіч. Паводле Лабановіча, пападаньне Лукашэнкі паміж кавадлам і молатам Усходу ды Захаду прывядзе не да падзеньня рэжыму, а да падзеньня Беларусі пад ударам усходняга молата. Гэта сапраўды небясьпечна. І той самы Лабановіч пераканаиы, што з расейскім рэжымам нам можа быць нашмат горш. Ён адзначае, што перад тварам новых выклікаў апазыцыя мусіць пераглядзець сваё стаўленьне да Лукашэнкі. Аднак падкрэсьлівае, што гаворка ня йдзе пра падтрымку Лукашэнкі ў пытаньнях эканамічных, палітычных ці культурных — але ў вельмі канкрэтным пытаньні сувэрэнітэту апазыцыя павінна адназначна выказацца. Вось такая пазыцыя Лабановіча.

Думаю, сп.Букчын пагодзіцца, што амаральна было б гандляваць сувэрэнітэтам.

Ю.Д.: Сп.Букчын, Вы абураецеся стаўленьнем аднадумцаў Дынька да Расеі. Але прыгадаем некаторыя падзеі апошняга часу: крызыс вакол украінскай касы Тузла, расейскі плян урэгуляваньня прыднястроўскага канфлікту, які вёў да распаду Малдовы, небясьпечныя гульні Крамля з грузінскімі аўтаноміямі. Зразумела, калі Пуцін гаворыць пра «мухаў і катлеты», камусьці можа спадабацца, як гаспадар Крамля «мочыць» Лукашэнку, якому дома ніхто супрацьстаяць ня можа. Але з улікам прыгаданых мной фактаў, ці толькі Лукашэнку ён «мочыць»? Хачу прыгадаць і вядомае інтэрвію Рагозіна «Бі-Бі-Сі», дзе ён ня толькі заявіў, што «беларуская дзяржаўнасьць — гэта недарэчнасьць», але і дадаў: «Для мяне няма розьніцы паміж Шушкевічам і Лукашэнкам. Абодва нацыяналісты, а Лукашэнка нават горшы». Ня можа такога быць, што мы тут пабудуем дэмакратыю, але будзем Паўночна-Заходнім краем Расеі. Ня можа таксама быць, што мы станем незалежнай краінай, увойдзем у Эўразьвяз і пры гэтым у нас застанецца безальтэрнатыўны парлямэнт і на выбарах кандыдаты будуць атрымліваць па 98% галасоў. Адно можа прыйсьці толькі разам зь іншым. І галоўнай умовай гэтага «пакету» зьяўляецца ўмацаваньне нацыянальнага пачуцьця, адчуваньне сябе беларусамі, гонар за сваю краіну, умацаваньне нацыянальнай эканомікі, яе пераарыентацыя з выключна ўсходняга рынку на розныя рынкі. Усё гэта, мусіць, прыйдзе разам.

Камэнтуючы ў «Нашай Ніве» вынікі выбараў у Расеі, мы не маглі не зьвярнуць увагі, што гэтыя вынікі трактуюцца аднолькава як у апазыцыйным, гэтак і ва ўрадавым друку. Гэта знак пэўнага нацыянальнага адзінства. Тут паказальная і самая аднолькавасьць, і той факт, што і адны, і другія трактуюць вынік выбараў як пэўную пагрозу.

Украінскія палітыкі могуць спрачацца і па ўнутраных пытаньнях, і наконт адзінай эканамічнай прасторы, і па пытаньнях эўраінтэграцыі. Але ў пытаньні касы Тузла спрэчак не было, украінскі парлямэнт быў аднадушны.

Калі за аднолькавым бачаньнем беларускіх інтарэсаў прыйдзе таксама разуменьне, што гэтыя нацыянальныя інтарэсы зможа забясьпечыць толькі дэмакратыя і ўмацаваньне сувязяў з Эўропай — тым лепш. Хто б гэта ні зрабіў — такога чалавека варта будзе падтрымаць. Прыгаданы Яўген Лабановіч мае рацыю, калі кажа, што «мала шанцаў на тое, што гэта зробіць Лукашэнка». Але калі б Лукашэнка стаў такое рабіць — Божа мой, трэба пакінуць адчыненымі дзьверы і для яго.

Ю.Д.: Сп.Букчын, мяне зьдзівіла ў Вашым артыкуле адна думка. «Лукашэнкаўцы будуюць Беларусь безь беларусаў, безь беларускай культуры. Усё гэта магчыма толькі на падмурку сапраўднай дэмакратыі». Але ж Бісмарк будаваў Нямеччыну «жалезам і крывёй». У Варшаве стаіць помнік Пілсудзкаму. А якім дэмакратам быў пан маршал — Вы ведаеце ня горш за мяне. Шмат якія дзяржавы ствараліся «моцнай рукою» ці пры «моцнай руцэ». І толькі беларусы, паводле Вас, могуць зрабіць гэта толькі праз дэмакратыю. Чаму?

С.Б.: Вашы паралелі — гэта нацяжкі. Прэзыдэнт Беларусі нават не гаворыць са сваім народам па-беларуску. Гэты факт сьведчыць пра тое, што Лукашэнка цалкам адмаўляе існаваньне нацыі і культуры. Для яго ёсьць пэўная тэрыторыя, над якой ён хоча ўладарыць невядома колькі, можа, усё жыцьцё. Ён разумее, што ў сьвеце існуюць нацыянальныя дзяржавы, іншых няма. Таму нейкі такі калярыт павінен быць: гэтая мова павінна трошкі гучаць на тэлебачаньні, на радыё, нейкія нацыянальныя тэатры павінны быць, але далей — не. Далей ён адчувае ўсё чужое для сябе, неадпаведнае сваёй натуры. Бісмарк гаварыў па-нямецку, і Пілсудзкі зьвяртаўся да палякаў па-польску. І ў гэтым — галоўная розьніца. Лукашэнка будуе Беларусь безь беларусаў, безь беларускай культуры.

Ю.Д.: Сп.Дынько, у мяне да Вас пытаньне, на першы погляд, крыху ўбок ад тэмы размовы. Свой артыкул Вы сканчаеце словамі «70% беларусаў хочуць, каб Беларусь увайшла ў Эўразьвяз. Гэта раней ці пазьней абавяжа». Але, паводле зьвестак таго ж НІСЭПД, прыкладна столькі ж беларусаў хочуць аб'яднаньня з Расеяй. А паводле самага апошняга апытаньня, дзе пытаньне задавалася «рубам» — ці на Ўсход, ці на Захад, — вынік выйшаў такі: амаль 50% — за аб'яднаньне з Расеяй і толькі крыху больш за траціну — за ўступленьне Беларусі ў Эўразьвяз. А гэта, гаворачы Вашымі словамі, таксама «рана ці позна абавяжа»?

А.Д.: Сапраўды ёсьць гэтае раздваеньне сьвядомасьці. Як раней беларусы хацелі і незалежнасьці, і аб'яднаньня з Расеяй адначасова, гэтак і цяпер шмат беларусаў хочуць адначасова і ўступленьня ў Эўразьвяз, і аб'яднаньня з Расеяй, не разумеючы, што гэта немагчыма, што трэ будзе выбіраць.

Сямён Букчын: Прэзыдэнт Беларусі нават не гаворыць са сваім народам па-беларуску. Ён будуе Беларусь безь беларусаў, безь беларускай культуры.

Затое давайце паглядзім на дынаміку гэтых лічбаў. Па-першае, колькасьць людзей, якія хочуць уступленьня Беларусі ў Эўразьвяз, расьце. А лік тых, якія хочуць аб'яднаньня з Расеяй, падае. Па-другое, сярод прыхільнікаў эўраінтэграцыі большасьць — людзі маладыя, адукаваныя. А сярод прагных аб'яднаньня з Расеяй — большасьць старых, пэнсіянэраў, сацыяльна неабароненых. Я мяркую, што будучыня адназначная: лік прыхільнікаў эўраінтэграцыі будзе расьці, а лік прыхільнікаў аб'яднаньня з Расеяй будзе няўхільна скарачацца.

Друкуецца адначасова ў «Нашай Ніве» і «Народнай волі».

«Сонцакрыж» Шатэрніка

У Музэі сучаснага мастацтва адкрылася выстава скульптара Алеся Шатэрніка «Сонцакрыж» — творы жывапісу, скульптуры, паэзіі. На выставе 18 скульптураў дзеячоў беларускай гісторыі (князь Вітаўт, Эўфрасіньня Полацкая, Яўген Кулік), 26 карцінаў. На адкрыцьці выставы А.Шатэрнік сказаў, што марыць паставіць каля менскай Ратушы кампазыцыю з постацяў Сыракомлі, Дуніна-Марцінкевіча й Манюшкі.

Заслаўе-2004

23—24 студзеня пройдзе IV Фэстываль камэрнай музыкі «Заслаўе-2004». Дбае пра гэта няўрымсьлівы прафэсар Міхал Фінберг. Сёлетні фэст прысьвечаны Міхалу Ельскаму, 100-годзьдзе з дня сьмерці якога ўшаноўваецца. У праграме таксама творы Напалеона Орды, Восіпа Казлоўскага, Мацея і Антонія Радзівілаў. Упершыню выканаюць сымфонію Эрнста Ванжуры, шклоўскага кампазытара канца XVIII ст., ды першага настаўніка Фрэдэрыка Шапэна Вайцэха Жыўнага, які таксама працаваў у Беларусі.

Арлоў і Бартосік у хатцы

У аўторак, 27 студзеня, у філіі музэю Багдановіча «Беларуская хатка» (Рабкораўская, 19) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Уладзімера Арлова «Адкусі галаву вароне». Аўтар прачытае новыя творы. Засьпявае Зьміцер Бартосік. Праезд да ст.м. «Інстытут культуры». Пачатак а 18-й. Уваход вольны.

Канцэрт «Pete Paff»

29 студзеня ў Палацы культуры вэтэранаў (Янкі Купалы, 21) адбудзецца канцэрт гурту «Pete Paff» — негітарнага праекту Піта Паўлава. Кірунак сам Піт вызначыў як «фольк з выкарыстаньнем традыцыйных інструмэнтаў», сярод якіх чамусьці ёсьць туба. Гурт выканае ня толькі народныя песьні, але й кампазыцыі «Red Hot Chili Peppers», «Metallica», «R.E.M.», «NRM» і «Вопляў Відаплясава». Дэбютны дыск «Pete Paff» пад працоўнай назвай «Вясковы» мае выйсьці ўвесну. Пачатак канцэрту ў 19.00. Квіткі 4500 руб.

IN MEMORIAM

АЛЯКСАНДАР ДЗЬМІТРЫЕЎ

Чэслаў Немэн падчас менскага канцэрту ў Палацы спорту. 1977 г. Ня ўсе ведаюць, што ён нарадзіўся ў Беларусі, у Старых Васілішках, ля Нёману.

Бацька-Немэн

Калі я прачуў пра тое, што здарылася, палез на паліцы, на якія ў апошнія гады зазіраю ўсё радзей. Тэхналёгія, ведаеце, адбіваецца: старыя вінілавыя дыскі слухаю зусім рэдка. Падлічыў: з дыскаграфіі Чэслава Немэна маю тых вінілаў ажно дзесяць. Але гэта далёка ня ўсё, што засталося па музыканту. Засталіся і ўспаміны.

Першы ўспамін: віхура польскага біг-біту, якая накаціла на СССР у другой палове 60-х. Безупынныя гастролі ў Менску «Чырвоных гітар», «Трубадураў», «Скальдаў»... Палякі тады закрылі сабой тое, што адбывалася ў моладзевай музыцы далей, за Ля-Маншам і акіянам. Бо яны былі тут, іх запісы можна было здабыць лягчэй, чым запісы ангельцаў ці амэрыканцаў, зь імі можна было папросту перагаварыць нават у «Юбілейцы» зь яе дбайнай аховай. Немэна тады ведалі ў нас з выступаў ня столькі зь «Небеска-Чарнымі», колькі з уласным гуртам «Акварэле». Для самога яго гэта быў крок наперад — ад выкананьня звычайных пёсэнек да стварэньня ўласнага стылю. Яго песьня «Dziwny jest ten Swiat» узварушыла ўсю Польшчу, бо дазволіла са сцэны, якая вызначалася пераважна для забавы, на поўны голас (і які голас!) загаварыць пра рэчы сур'ёзныя.

Але Немэну зрабілася вузка ў рамках песеннай традыцыі. І ён зрабіў крок, на які не адважыўся ў тыя гады ніводзін рок-музыка «сацлягеру»: стварыў групу пад загадкавай назваю «Энігматык». Ягоным партнэрам зрабіўся славуты саксафаніст Зьбігнеў Намыслоўскі, асноўнаю формаю выказваньня — разгорнутыя, са складанай структурай і музычнай мовай, «нефарматныя» кампазыцыі. Гэта быў 1969 год, калі «Deep Purple» толькі запісвалі альбом зь Лёнданскім сымфанічным аркестрам, а трыё «Emerson, Lake & Palmer» рыхтавала дэбютны альбом. А Немэн быў ужо самім сабой.

Другі ўспамін: Чэслаў Немэн прыехаў у Менск у 1977 г., выступаў у Палацы спорту. Заля была забітая аж па берагі. У Беларусі выдатна ведалі многія яго творы «пасьляакварэльнага» пэрыяду: «Jednego serca», «Nie jesteś moją», «Nim przyjdzie wiosna», «Kamyk». Ды найбольш «тырчэлі» ад магутнай кампазыцыі «Bema pamięci Żalobny — rapsod», якая займала ўвесь першы бок альбому. Немэн выступаў у складзе квартэту і, калі аб'явіў «Jednego serca», нехта на галёрцы ў захапленьні адчайна закрычаў. «Што здарылася? — спакойна, па-расейску запытаў сьпявак, стоячы ў атачэньні нябачаных тады ў Менску «Мугаў» і іншых электронных клявішных. — Можа, лекара паклікаць?» Ён не выносіў мітусьні вакол сябе і не лічыў сябе зоркай. Ён прывык проста сумленна працаваць. Канцэрт той стаўся шокам: мала хто чакаў ад Немэна гэткай складанай, насычанай музыкі. І ўжо тады многія яго пачалі не разумець. Аднак чым далей, тым больш ён рабіўся музыкам не калектыву, а індывідуальнай творчасьці.

Успамін трэці: першы Ўсесаюзны фэстываль польскай песьні ў Віцебску, 1988 год. Нікому не вядомы сьпявак з Горадні Валеры Скаражонак засьпяваў у конкурсе «Nim przyjdzie wiosna». Шок сярод польскіх журналістаў і — другая прэмія для сьпевака. Выконвалася па сутнасьці клясыка.

Чэслаў Немэн першы прабіў дзяржаўныя й ідэалягічныя межы сацыялістычнай зоны, сьцьвердзіўшы, што тут таксама можа нараджацца непаўторная, арыгінальная музыка. Ён быў першым артыстам, што вырваўся за дрот сацлягеру і выдаў у ЗША два альбомы. Няхай адзін зь іх быў зь песьнямі кшталту «Елочки-сосеночки» ды «Бродяга», якія ён сьпяваў з крыху знарочыстым расейскім акцэнтам. Хадзілі чуткі, што яго запрашалі вядучым вакалістам у склад славутых «Blood, Sweat & Tears». Але дакладна — яго можна лічыць бацькам усяго, што мы цяпер называем «славянскай папулярнай музыкай». Ён дыктаваў моду, якая часам апярэджвала моду эўрапейскую. Ён адкрыў палякам, а ўсьлед за імі й нам, скарбніцу польскай паэзіі, найперш Цыпрыяна Норвіда, якога я асабіста пачаў шукаць у кнігарнях толькі пасьля таго, як паслухаў «Bema pamięci Żalobny — rapsod».

Музыкант, якога я асабіста паставіў бы поруч зь легендамі — Джонам Ленанам, Уладзімерам Мулявіным, — пайшоў з жыцьця 17 студзеня. Наўрад ці згадае хто яго ў вёсцы Старыя Васілішкі, недалёка ад Горадні, дзе ён нарадзіўся. Яго не прынялі ў музычную школу — мабыць, дзеля таго, што дрэнна сьпяваў песьні пра сьветлую будучыню. Ён не запісаў аніводнай беларускай народнай песьні. Магчыма, проста ня помніў іх. Але ён помніў радзіму. Бо нездарма Чэсік Выдрыцкі, хоць і з польскім акцэнтам, узяў за псэўданім назву беларускай ракі — Немэн. І згаданы будзе ў чарговым томе Беларускай энцыкляпэдыі.

І помніць яго будуць столькі, колькі тая рака будзе.

Дзьмітры Падбярэскі

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

Свабоду летуценьнікам!

Прэм'ера «Летуценьнікаў» Бэрталючы прайшла ў Менску 19 студзеня. Прайшла спакойна, безь цісканіны ля касаў. Мо таму, што ў першы дзень было два сэансы. Заля сабралася поўная. У асноўным прыйшлі 20—25 гадовыя. Але сярод гледачоў былі заўважаныя і такія культавыя творцы, як Уладзімер Арлоў.

Цікава ўсьведамляць, што 20-гадовыя ў сваім 1968-м героі фільму — гэта сёньняшнія 55-гадовыя. Як, чытаючы Рэмарка, цікава ўсьведамляць, што яго «згубленае пакаленьне» — гэта нямецкія генэралы другой усясьветнай. Эўрапейскія залатыя 60-я ў фільме ідуць фонам: закадравай музыкай Джэніс Джоплін і Морысана, паліцэйскімі сырэнамі за акном, маніфэстацыямі ў тэлевізары. У цэнтры ж увагі — маленькае сьвята непаслухмянасьці: бацькі зьехалі на месяц, пакінуўшы дарослых дзяцей Тэа і Ізабэль ды іх амэрыканскага сябра Мэцью бавіцца ў вялізнай кватэры.

Фірмовы кактэйль Бэрталючы: вазьмеце крыху інфантылізму, дадайце эротыкі — роўна столькі, колькі яе бывае ў жыцьці ў 20 гадоў, — густа аздобце здабыткамі сусьветнага кінэматографу, замяшайце ўсё гэта ў Парыжы, а пасьля падліваўце лявацкія погляды, пакуль субстанцыя не пачне пеніцца. Стрыптыз перад бюстам Мао, мастурбацыя пад пільным поглядам таварышаў, натоўп зь сярпаста-малаткастымі сьцягамі, што камічна драпае ад паліцыі. Рэжысэр падсьмейваецца з сваіх герояў і сябе тагачаснага. (Ён расчараваўся ў камуністычных ідэях, калі тэрарысты з «Чырвоных брыгадаў» забілі італьянскага прэм'ера Альда Мора.)

Ёсьць і танчэйшая іронія: пацыфіст, які толькі-толькі асуджаў вайну ў Віетнаме, кідае кактэйль Молатава ў паліцыянтаў; дзеці пагарджаюць бацькамі, але жыць ня могуць бяз татавых чэкаў. Кіно, уласна, пра няўменьне даць рады свабодзе, якая «бярэ за жабры». Дагэтуль героі ня мелі патрэбы штосьці вырашаць у жыцьці: дастаткова было абраць зручную кінацытату. Для выпадкаў, на якія цытат не стае, ёсьць самагубства. Дый нават яно — кіношнае. А абставіны не дазваляюць героям скарыстацца й з гэтае апошняе магчымасьці...

Вядома, што ў амэрыканскі пракат стужка выйшла адцэнзураванай. Тым, хто пойдзе глядзець, раю паразважаць, якія менавіта эпізоды выразалі амэрыканцы.

Ігар Няхведараў

ARCHE: 5 гадоў, 29 нумароў

Інтэлектуальны часопіс «ARCHE» ў лістападзе адзначыў сваё 5-годзьдзе. Ні пра якія сьвяточныя імпрэзы не было чуваць. Шараговым у сэнсе вонкавых эфэктаў аказаўся і першы пасьля пяцігодзьдзя сшытак часопісу.

Адкрываецца нумар падборкай артыкулаў і гутарак на тэму «Эўропа на ўсход Эўропы» — пра Беларусь і яе суседзяў.

У адным з наймацнейшых артыкулаў нумару Алег Латышонак крытычна перачытвае бэстсэлер Гантынгтана «Сутыкненьне цывілізацый». Кароткая гутарка з ангельскім дасьледчыкам Эндру Ўілсанам, а таксама вынікі дасьледаваньняў Беларусі шатляндзкімі сацыёлягамі (Стывэн Уайт «Эўрапейскі ці славянскі выбар Беларусі») дазваляюць пабачыць нашу нацыю збоку. Здаецца, мы ў межах нормы.

Не стае прозы, затое друкуецца густоўная падборка паэзіі (вэрлібры Бураўкіна, якія стануць нечаканасьцю для многіх прыхільнікаў паэта, нізка вершаў Сільновай і ўрывак з культавага рокера Ніка Кейва ў перакладзе Аляксея Знаткевіча).

Шмат крытыкі. Даніла Жукоўскі раскладае па палічках здабыткі мінулага літаратурнага году. Піша ён пра новыя творы Іпатавай, Наварыча, Брава, Бабкова і бадай усіх, хто летась гучаў. З ацэнкамі можна не пагаджацца, але аўтарскі стыль такі, што, прынамсі, ягоная зыходная пазыцыя ясная, а таму спасьцігаеш — хоць і мэтадам супастаўленьня сваёй зыходнай пазыцыі з аўтарскай, — што чытаць варта, а чаго ня варта. Як любы заўзяты крытык, Жукоўскі не абыходзіцца без памылак. «Будзьце рэалістамі, патрабуйце немагчымага», — гэта казалі не францускія студэнты палітыкам, а Жан-Поль Сартр — студэнтам.

Гарадзенскі лірык Юры Пацюпа ў «ARCHE» выступае на гэты раз як мовазнаўца. Ён робіць шэраг лягічных і грунтоўных правапісных прапановаў, у тым ліку ў напісаньні прыназоўніка «у» перад словамі, што пачынаюцца з галоснага гуку. Навуковы артыкул — а захапляльна!

Ну, і (нарэшце!) сканчаецца параўнаўчы аналіз палітычных працэсаў у Сэрбіі і Беларусі, які друкаваўся ў часопісе праз увесь год. Тэкст таксама не эфэктны, але глыбокі ў сваіх думках. Чым нас пацешыць палітоляг Сіліцкі налета?

Адсутнасьць «эфэктаў» мне й даспадобы ў часопісе, вокладку якога ў гэты раз аздабляе анёльчык аўтарства Ўладзімера Адамчыка. «ARCHE» вылучаецца сярод глянцавага шыку на нікеляваных паліцах найсучаснейшых шапікаў «Белсаюздруку» на праспэкце Скарыны ежкім чорным хлебам тэкстаў, які кантрастуе з ласункамі ілюстраваных часопісаў. Як па-мойму, здаровая пажыва для тых, чые мазгі не засохлі.

Сяргей Гезгала

Крывіцкае ткацтва раскладзена на піксэлі

Традыцыйнае беларускае ткацтва зь віртуальнай рэальнасьцю спалучыла віцебская мастачка Сьвятлана Баранкоўская. Яе выстава «Крывічанка» адкрылася ў гарадзенскай галерэі «Тызэнгаўз». Баранкоўская вынайшла аўтарскую тэхніку выкананьня: яна спалучае воўну, лён і газэтную паперу. Мастачка перакладае малюнкі на лічбавы відарыс з дапамогай электронікі. Выстава адкрытая да пачатку лютага.

Павязуць Мусаргскага ў Маскву

У Расеі — год беларускай культуры (афіцыёзнай). Аркестар Фінберга выступіць з канцэртамі ў гарадах «Залатога кола». З канцэртамі ж выступяць таксама «Сябры», «Песьняры», «Беларускія песьняры» й інш. У красавіку ў Трацьцякоўскай галерэі пройдзе выстава «100 шэдэўраў Нацыянальнага мастацкага музэю Беларусі». Вялікі тэатар пакажа ў Маскве опэру Мусаргскага «Хаваншчына» і балет Пракоф'ева «Рамэа і Джульета». У Новасібірску плянуюцца Дні беларускага кіно. У Расеі паставяць таксама два «беларускія» помнікі — Янку Купалу ў Маскве і Францішку Скарыну ў Караляўцы. Да адкрыцьця апошняга прымеркаваныя Скарынаўскія чытаньні.

Прэміі Елізар'еву і Кудраўцавай

Ляўрэатамі балетных прэмій «Філіп Морыс» сталі балерына Людміла Кудраўцава (намінацыя «Філіп Морыс Дэбют») і мастацкі кіраўнік беларускага балету Валянцін Елізар'еў («Жыцьцё ў мастацтве»). Л.Кудраўцава танчыць вядучыя партыі ў балетах «Спартак» (Фрыгія), «Жызэль» (Жызэль), «Рамэа і Джульета» (Джульета) і інш. Бальшыню тых спэктакляў паставіў Елізар'еў. Ён жа — старшыня журы конкурсу на атрыманьне прэміяў тытунёвай кампаніі.

Несьцерка-мульцяшка

Студыя анімацыйных фільмаў стварае першы мультсэрыял для дарослых «Несьцерка» пра прыгоды вясёлага героя беларускіх казак і яго сяброў. Кінарэжысэр — Ігар Воўчак, драматург — Дзьмітры Якутовіч. Крытыкі захапляюцца самой ідэяй.

15 гадоў «Белорусскому климату»

Арт-гурт «Белорусский климат» адзначыў 15-годзьдзе вечарынай у «Новым клюбе». Сярод удзельнікаў гурту — музыкі Валік Грышко, Філіп Чмыр з «Drum extasy», паэт Дзьмітры Строцаў.

Аўчароў-лятун

Сьпявак Уладзімер Аўчароў ізноў памяняў месца працы. Пераехаў з Кіева ў Менск, не пасьпеў абжыцца — і ўжо «зьвязвае свае пляны з Масквой». Зьняўся там у расейскім сэрыяле, марыць пра мюзыкл.

Курдзкая псыхадэліка

У залі менскай Музычнай вучэльні гучала курдзкая музыка. Выконваў яе Масуд Талібані, вядомы з супрацы з гуртам «Крыві». Сп.Масуд вучыўся ў Менску на архітэктара, але па вяртаньні на радзіму зразумеў, наколькі моцна прырос да Беларусі: «Вось прыехаў у Іран, але засумаваў там, нават показак мясцовых ужо не разумеў. Вярнуўся ў Менск — яшчэ раз пабачыцца зь сябрамі», — прызнаваўся музыка. Цяжкай на ўспрыманьне выявілася курдзкая музыка. У адной зь песень сьпявалася пра няшчаснага закаханага, які просіць сяброў прынесьці яго да любай, бо сам ня ў стане ісьці — вось, маўляў, што зрабіла са мной твая пяшчота... Ды ўсё гэта пад музыку з псыхадэлічна аднастайнай, мэдытацыйнай рытмікай. Дах пачынае зьяжджаць пасьля некалькіх песень! Пачуцьцёвыя натуры гэтыя курды.

Кіно па-арамейску

Актор Мэл Гібсан, які зьняў фільм «Пакуты Госпадавы» пра 12 апошніх гадзінаў жыцьця Хрыста, хоча, каб кіно ішло ва ўсім сьвеце безь перакладу. Героі фільму гавораць толькі па-арамейску й на лаціне. Гібсан лічыць, што пераклад непатрэбны, бо гледачы і так павінны ведаць біблійны сюжэт. Урэшце, ён пагадзіўся, каб кіно было з субтытрамі.

Домскі сабор — на рэстаўрацыю

У Рызе пачнуць рэстаўрацыю Домскага сабору. Увесь праект (дасьледаваньне, праектаваньне і поўная рэстаўрацыя) будзе каштаваць каля 8 млн латаў (блізу 16 млн даляраў). Зь іх 250 тыс. латаў пойдзе на рэстаўрацыю славутага аргана. Дзяржава фундуе ўсе працы. Рэстаўрацыя мае скончыцца ў 2011 г. — Домскі сабор акурат тады адзначыць сваё 800-годзьдзе.

Сяргей Будкін, АВ; БелаПАН; pahonia.promedia.by

КАЗКІ ЖЫЦЬЦЯ

Белая дарога

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Пачатак новага году заўсёды хочацца адзначыць нечым новым і аўтабіяграфічна важным. Пабрацца шлюбам ці зьмяніць месца працы або хаця б адкрыць для сябе новую дарогу да яе.

«Хопіць карыстацца падземнымі хадамі — чорнымі тунэлямі мэтро! Штучнае асьвятленьне станцыяў не ратуе ад адчуваньня сацыяльнай крыўды: багатыя ж езьдзяць па зямлі, над намі, у сваіх партманэ-аўтамабілях, — падумалася неяк на пачатку студзеня. — А што? Пашукаю на зямлі шчасьця і я!»

Наступнай раніцай я выправілася на працу пешшу. Выявілася, што наверсе нашмат менш народу. Рэдка хто зь мінакоў мімаходзь закранае прыватную прастору — мой нябачны «крыналін» на паўмэтра вакол.

Рабочыя зграбаюць сьнег з дарогі, раскідаючы шуфлямі на два бакі, — здаецца, дзеля таго, каб па ёй годна прайшла я. Ва ўсякім разе, яны ветліва спыняюцца пры маім набліжэньні і на момант адхінаюць убок свае ваяўнічыя прылады працы. «Гвардзейцы!» — паблажліва і ўхвальна ўсьміхаюся ім я, беручы пад увагу, што і апранутыя яны ў аднолькавыя яркія спэцстроі.

У вітрынах шыкоўных наземных магазынаў (не параўнаць з тымі, што ў цесных падземных пераходах!) застылі манэкены — вытанчаныя, бледнаскурыя фаварыты сучаснай моды. Часам мне здаецца, што канчатковая мэта іхняй эвалюцыі як носьбітаў зматэрыялізаваных эстэтычных ідэяў замежных куцюр'е — шкілет або сьпіралепадобная драцяная канструкцыя. Так бы мовіць, вясёлы і страшнаваты «цырк на дроце»! У тых прасторных вітрынах застылі ня толькі манэкены — у рытуале вітаньня і непрыхаванае дэманстрацыі застылі, як ісьці далей, парфумавыя фляконы, шэрагі імпазантных бутэлек вінаў, іншыя тавары-падарункі. «Тут увесь мой каралеўскі двор!» — адзначаю я, стараючыся ступаць павольней. Актуалізацыя. Імправізацыя. Спантаннасьць...

Гэтая новая, белая, нясумная дарога прыводзіць мяне да плошчы Перамогі. Пасярод яе — Абэліск, асьветлены ранішнім зімовым сонцам. Зрок лёгка знаходзіць сылюэты ўрачыстых ялін... Гэта своеасаблівая прастора на маім шляху, прастора-вір, і я спыняюся. Як прыгожа! І як адмыслова наўкол! Раптам сярод рыштаваньняў увагнутага, нібы далонь, дому, які рэстаўруецца, я ўгледзела фірмовы знак «Caparol» — сьмешнага слана ў вэртыкальных каляровых пасках, із шчоткай замест хваста. Вясёлкавы слонік на смуглявай далоні велікана!

Шкада, што не магу пабыць на плошчы Перамогі даўжэй: хутка пачынаецца працоўны дзень! Але хіба я пабачыла б усё гэта і перажыла, дабіраючыся на працу чорнымі тунэлямі пад зямлёй, перапоўненым цягнікам мэтро, сьціснутая тулавамі іншых пасажыраў? (Адчайна зьвяртаючыся да іх у думках: «Асьцярожна! Не тапчыце мой нябачны крыналін!..») Не! Не! Не!

Назаўтра я пайду белай дарогай ізноў.

Людка Сільнова

Пакуль Ленін у маўзалеі, ён жывы

Працяг са старонкі 2.

За столькі гадоў можна чалавека пераканаць у чым хочаш — напрыклад, у тым, што ён сабака. Ці дрэва. Ці геній. Бо зрабілі ж генія са Сталіна, хоць быў гэта чалавек кепска выхаваны і прымітыўны. Ну і да таго ж, усё гэта вырастала на дражджах з крыві. І мноства людзей у гэта верылі, бо яшчэ ўчора пралівалі кроў. Чужую. І, вядома ж, верылі ў тое, што забівалі за слушную справу. У Грамадзянскай вайне ў Расеі загінула 13 мільёнаў чалавек з абодвух бакоў. І, вядома, тое, што потым казалі, — што гэта было справядліва, для дабра рабочай клясы, яе шчасьця і г.д. — народ прымаў, бо менавіта за гэта змагаўся.

— Можа, людзям не ўдаецца жыць з пачуцьцём віны і ім хочацца саміх сябе абяліць… Але чаму гэтая ідэалёгія перамагла менавіта ў Расеі? І што зь ёй адбываецца цяпер? Тое, што ніхто не адмаўляецца ад ордэнаў Леніна, я, урэшце, разумею: за дзесяцігодзьдзі людзі прызвычаіліся, а лішнія грошы нікому ня шкодзілі. Але з Вашай кнігі «Зьмярканьне», прысьвечанай Леніну, ясна вынікае, што гэта ён вынайшаў масавы тэрор.

— Так, менавіта ён. І калі людзям кажуць, што гэта зь ягонае ініцыятывы зьявіўся дэкрэт аб чырвоным тэроры, які ён, урэшце, уласнаручна падпісаў, можна пачуць: «Ну што ж, такое было становішча». А што такога тая буржуазія зрабіла? І хто распачаў Грамадзянскую вайну? Хто зь першага дня пачаў ліквідацыю амаль усіх клясаў, за выключэньнем сялян і рабочых, хоць пазьней і да іх дабраліся? Хто зьнішчыў расейскую інтэлігенцыю? За якую правіну? Той самы аргумэнт: «Такая была сытуацыя — ішла барацьба».

Слова «барацьба» я ўвогуле не выношу! Залезьлі мы некалі на барыкады, каб зь нечым там змагацца, — і канец. Трапілі ў псыхалягічную пастку. Калі расправіліся з замежным ворагам — перамаглі ў вялікай айчыннай вайне, — ну дык пачалі змагацца са спадніцамі ў абцяжку, міні-спадніцамі, няправільнай музыкай і чорт ведае з чым. У нас былі нават лягеры для дзяцей. І неяк гэта ня робіць асаблівага ўражаньня! Калі я выступаю, бывае, гэта да людзей даходзіць, але здараецца, што чую: «Ды пра што вы гаворыце, навошта корпацца ў мінулым?» Як жа гэта — забыць уласнае мінулае? Затое мы сьпяваем сталінскі гімн — вось да чаго даводзіць замоўчваньне мінуўшчыны.

— Бо «хто кантралюе мінуўшчыну, той кантралюе сучаснасьць»?

— Менавіта так.

— У сваёй кнізе Вы цытуеце вялікага фізыка Лява Ландаў, які сказаў: «Ленін быў першым фашыстам, гэта ясна». Відаць, таму, што ён, як Гітлер, ацэньваў чалавека па тым, хто яго нарадзіў. Сьмяротны прысуд вызначала паходжаньне — клясавае ці расавае. Гэта вельмі зручны крытэр: адразу відаць, хто вінаваты.

— Якраз у гэтым усё і заключаецца. Фашызм і бальшавізм часам немагчыма адрозьніць. Гвалт і тут, і там. Божа мой, у нас пачалі будаваць сацыялізм, а трохі пазьней у Трэцім Райху — нацыянал-сацыялізм. Цяпер і ў нас ёсьць нацыянал-сацыялісты, напрыклад Сяргей Глазьеў з блёку «Радзіма». «Народ расейскі, народ па-над усім, у нашай краіне павінны жыць толькі расяне». І цяпер, амаль адначасова, яны гавораць пра сацыялізм — што ня ўсё пры сацыялізьме было дрэнна. Але што канкрэтна было добрага, я неяк не магу прыгадаць. Некалі я папрасіў аднаго такога, каб ён пералічыў мне гэтыя добрыя рэчы, бо, можа, я зусім зьехаў з глузду і ня памятаю. Але ён ня здолеў назваць ні адной…

— Зразумела, што такія лёзунгі, як у Глазьева, — гэта вельмі зручны інструмэнт…

— Для людзей, якія хочуць улады. Цалкам з вамі згодны.

— …але чаму менавіта Расея?

— Бо ў Расеі, пачынаючы ад часоў Маскоўскага княства, няспынна ішла нейкая барацьба. Ад XVI ст. мы ўвесь час вялі войны. У выніку маем мілітарызаваную сьвядомасьць і таму бесьперастанку высочваем, каму б гэта даць у морду. Або, прынамсі, рашуча асудзіць. І з прычыны нашай ваяўнічасьці мы лічым, што ўсе павінны рабіць так, як мы. Мы пераканалі самі сябе, што заўсёды маем нейкую містычную рацыю, пакліканьне. Аднак з часоў Маскоўскага княства да нас толькі раз ці два нехта добраахвотна далучыўся. Рэшта — выключна праз войны і заваёвы.

— Але ж так, мусіць, было ўсюды, ва ўсёй Эўропе?

— У такім маштабе? І так заўзята? Відавочна не. Напрыклад, узаемаадносіны вашай краіны, Польшчы, Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, зь Літвой выглядалі зусім іначай. А ў нас? Рэкі крыві. І экспансія на поўдзень, на ўсход. Ня ведаю таксама, у якой іншай краіне вайсковая служба працягвалася 25 гадоў. Чвэрць стагодзьдзя! Да такога сапраўды трэба ўмець дадумацца. А потым на гэтай гістарычнай глебе вырастае тэрор і анархія — гэта значыць, з аднаго боку, анархічны сацыялізм, а з другога — яго пабудова пры дапамозе тэрору. Дастаткова пачытаць, напрыклад, Нячаева — тым больш што гэта папярэднік Леніна, калі казаць пра ўжываньне тэрору як мэтаду барацьбы. «К тапару! За сякеру! За сякеру!» Рэвалюцыйны рух у Расеі паўставаў пад лёзунгам «К тапару!».

Потым прыйшлі бальшавікі — ізноў тэрор. «Мы пойдзем іншай дарогай», — так нібыта сказаў Ленін. Насамрэч ніхто ня ведае, калі менавіта, паколькі гэтая інфармацыя паходзіць ад ягонай сястры, якой ён нешта такое сказаў, але невядома чаму яна ўспомніла пра гэта толькі ў 1930 годзе. Аднак дапусьцім, што гэта праўда. Вельмі цікавая гэтая іншая дарога. Замест індывідуальнага тэрору — усеагульны.

— А сёньня? Што сёньня ў людзкой сьвядомасьці?

— Мешаніна. Ідзе, напрыклад, дыскусія пра парадак. Згода, парадку няшмат. І я таксама лічу, што трэба рабіць нешта са злачынасьцю, забойцаў ці рабаўнікоў караць так, як яны заслугоўваюць. Але навесьці парадак у краіне можна толькі праз дэмакратыю, дэмакратычныя мэтады прымяненьня ўлады, а не пры дапамозе міліцыі. Міліцыя павінна быць толькі памочнікам. Закручваньне гаек ні да якога парадку не прывядзе, а толькі ўзмоцніць страх. Што мы, зрэшты, адчулі на папярэдніх пакаленьнях. І людзі ўжо пачынаюць баяцца.

— Часам гэта відаць нават з таго, як яны гавораць.

— Ага. І што цікава, непасрэдных прэтэнзій нейкай газэце ці тэлебачаньню ніхто не выстаўляе. Але журналісты самі над сабой працуюць як сьлед. У іх гэта ў крыві. Ну, і баяцца — за сваё становішча, працу, дабрабыт.

— А можа, гэта ня нейкі канкрэтны страх, а нешта такое, што заўсёды вісела ў паветры, ніколі не зьнікала да канца?

— Ня выключана.

— Але ж хто, урэшце, стварыў стваральніка гэтага страху — Леніна? Гісторыя Расеі? Мэнтальнасьць расейскіх рэвалюцыянэраў?

— Вядома ж. Бо невыпадкова бальшавікі так змагаліся са Сталыпіным. Яны цудоўна разумелі, што калі Сталыпін ажыцьцявіць свае рэформы, дык ніякай рэвалюцыі ня будзе.

— Ну добра, але чаму цяпер, у XXI стагодзьдзі, адчуваецца такая туга па тагачасных традыцыях?

— Бо так прасьцей за ўсё. Дэмакратыя выключае простыя шляхі. Усе гэтыя размовы, дыскусіі, неабходнасьць браць пад увагу думку меншасьці — адны турботы. Навошта тлуміць сабе гэтым галаву? Прасьцей прыняць рашэньне — і канец. Тым больш што якраз гэтак мы кіравалі семдзесят гадоў. Потым выявілася, што нешта пайшло ня так. І мы прайгралі. Вядома, дэмакратыя значна больш турботная рэч, чым дыктатура. Яна вымагае розуму, адукаванасьці, міласэрнасьці, дакладнасьці. Гэта найбольш складаны лад. А мы ня любім складаных працэдур. Лічым за лепшае, напрыклад, рэзаць на вока. А раптам пашанцуе?

— Дык, можа, таму ён там дагэтуль ляжыць у Маўзалеі, а не ў зямлі, як любы нармальны чалавек?

— Вядома ж!

— І пакуль будзе там ляжаць, будзе жыць?

— Будзе, на жаль.

— Але ці ўдасца ўрэшце яго пахаваць?

— Яшчэ не цяпер. Не цяпер. Думаю, не раней за 2008 год.

— Пасьля чарговых прэзыдэнцкіх выбараў?

— Так.



AMOROZOV.RU

Аляксандар Якаўлеў (нарадзіўся ў 1923 г.) — расейскі гісторык. Член КПСС, з 1965 г. — сакратар ЦК, з 1985 — член Палітбюро.

- Вялікі фізык Леў Ландаў сказаў: «Ленін быў першым фашыстам...»

ПАСЬЛЯСЛОЎЕ РЭДАКЦЫІ

Пра ацэнку Кастрычніцкай рэвалюцыі і яе правадыра на пачатку 90-х спрачаліся палітыкі, журналісты і бацькі зь дзецьмі. Цяпер грамадзтва цікавіцца Леніным менш. Гэта стварае спакайнейшыя ўмовы для працы гісторыкаў. Заходнія навукоўцы выдалі «Чорную кнігу камунізму» («НН» пісала пра яе ў 2000 г.). Каштоўная праца на беларускім матэрыяле — нядаўна выдадзеная «Гісторыя Беларусі ад XVIII ст. да нашых дзён» Захара Шыбекі.

Цяжка рабіць ацэнкі камунізму ў краіне, у якой дагэтуль не адбылася дэкамунізацыя, дзе Ленін прысутнічае ў прасторы кожнага гораду. Няма адпаведнае адстароненасьці. Ясна, што камуністычны сацыяльны экспэрымэнт нельга падвёрстваць пад крытэры нашых дзён. Калі Ленін узьняў паняволеныя клясы на барацьбу за ўласнасьць і ўпершыню ў гісторыі давёў гэтую барацьбу да працяглае перамогі, сьвет быў, мякка кажучы, іншы, чым цяпер. Тады, да прыкладу, Крывавая нядзеля не прывяла да «імпічмэнту» цара, што здарылася б сёньня амаль непазьбежна. Выбарчае права тады амаль нідзе ў сьвеце не было ўсеагульным. Урэшце, паняцьце роўнасьці людзей не распаўсюджвалася на чорных ці жанчынаў. Нельга зводзіць усё і да крывавае арытмэтыкі: маўляў, Мікалай II забіў *х*, Ленін — *у*, а Гітлер — *z*, таму гэты кепскі, а гэты горшы. Дзяяч і ягоная эпоха заслугоўваюць ацэнкі і за доўгатэрміновыя гістарычныя наступствы сваіх дзеяньняў, і за адпаведнасьць канкрэтных учынкаў і рашэньняў права ды маралі свайго часу, і ў суб'ектыўным параўнаньні з сваімі сучасьнікамі.

Асабліва каштоўнае тут меркаваньне Аляксандра Якаўлева, які сам доўгі час быў на версе камуністычнае сыстэмы, а пасьля, вярнуўшыся да сваёй прафэсіі гісторыка, вывучаў самыя змрочныя старонкі савецкага мінулага — «чырвоны тэрор», сталінска-гітлерскі пакт аб падзеле Ўсходняй Эўропы.

Мы не хацелі б зьняважыць пачуцьці тых чытачоў «НН», якія маюць камуністычныя або левыя перакананьні. Спадзяёмся на іхныя водгукі. Бо менавіта для іх пытаньне пераемнасьці спадчыны Маркса, Леніна і Сталіна (вельмі рознай, дарэчы) або адмовы ад яе мае вялікае значэньне.

Аляксей Бацюкоў

чорнае апавяданьне

Глядзіце вячэрнія навіны

КАЛЯЖ. АРЦЁМА ЛЯВЫ

Мокры сьнег напярэдадні сьвята. Без шасьці хвілін поўдзень. Вецер, калючыя сьняжынкі ўпіваюцца ў вушы. Дарога, ліхтары ў тумане, ці, дакладней, расьцярушанай у паветры сьце. Чамусьці не халодна, нават утульна, нягледзячы на мокрыя шкарпэткі і здубелыя, аж да болю, запясьці. Утульна нейкай вычварнай утульнасьцю — так, як толькі гэта магчыма, калі хвалі ветру раз-пораз то джаляць твар заледзянелымі кроплямі, то ляпаюць па шчаках плюхлымі, як марынаваныя грыбы, камякамі.

Два сумныя белыя агні выплылі з-за павароту і нетаропка пракраліся міма. Паламаны аўтобус, увесь ад колаў да даху ператвораны ў агульную брудна-жоўтую пляміну, перасякнутую ўсьмешкай індыйскай прынцэсы. Пад рукой зазьвінела.

— Слухаю.

— Аляксей? — гэта была галоўная рэдактарка. — Яны выехалі.

— Добра.

Утульна сьпінай прылегчы на хвалі паветра, расьсякаць іх каўняром і слухаць іх вусьцішны енк. Утульна было нават выйсьці з дому на тэрміновы званок са студыі — зь першага кроку ад ганку ўвайсьці ў раскіслую, крыху прыцярушаную зьверху малочна-белым сьняжком гліну. Заўсёды мяне чамусьці радавала непагадзь — за тое асабліва абвостранае адчуваньне спакою і абароненасьці чалавека ў палітоне, якое толькі й магчымае пры дрэнным надвор'і. Гэткае тонкае мастацтва — радавацца ўласнай чысьціні, ідучы ў брудзе. Быць адкрытым кожнаму ветру, захоўваць хісткую мяжу паміж уласнай цеплынёй і той халадэчай, якая немачна імкнецца разьвязаць тваё скручанае ў тугі вузел цела.

— Касэту з запіскай я дала апэратару, — працягвала галоўная рэдактарка.

— Добра, — ізноў адгукнуўся я.

Хвілін праз пятнаццаць пад'ехаў сіні «рафік» з таблічкай TV на лабавым шкле. Двума гарбамі на пярэдніх сядзеньнях цямнелі кіроўца з апэратарам.

— Змэрз? — кіроўца сунуў мне руку. — Здоровэнькі булы.

На маю беларускую мову ён любіў бліснуць украінскай.

— Ну, — я сеў назад. — Дзе касэта?

— Я ўжо паставіў, — апэратар Міша ляпнуў па камэры.

— А падкасэтнік пакінуў на студыі, вядома ж?

— Ну, — ён азірнуўся. — А што?

— Там была запіска.

— Так? — Міша засьмяяўся. — Ну добра. Мы знаем, куды ехаць. — Табе расказалі, што за выезд?

— Нехта забіўся.

— Дзеўка кінулася з акна. З чацьвертага паверху, але насьмерць.

— М-да, — паківаў кіроўца, аглядаючы дарогу праз сьцяну вільгаці.

— Вось не люблю такіх выездаў, — Міша скрывіўся. — Нешта не па сабе.

— Чаго яна кінулася? — спытаў я.

— А чорт ведае.

У машыне было горш, чым на вуліцы. Крыху цяплей, але недастаткова, каб прыцішыць агульную эстэтычную няўтульнасьць ад падраных крэслаў, трэснутае шыбы, мяккай кашыцы зь недаталага сьнегу і пяску пад нагамі. Тут толькі што курылі, у нос нахабна лезла гаркавата-сухое адценьне тытунёвага дыму.

Рэзкі паварот азваўся ва ўсім целе ныцьцём недабудженых чэлесаў, нават болем. Толькі цяпер пачалі мерзнуць пальцы.

Я пакруціў у руцэ тэлефон, але, пашкадаваўшы грошай, вырашыў ня зьвязвацца з галоўнай рэдактаркай. Апэратар кінуў яшчэ пару слоў пра дзеўку, цераз плячо: упала на чыюсьці машыну, «мэрс», разьбіла ўшчэнт. Сапсавала ўсім выходны дзень.

— О-па. Вось яны, — я паказаў на натоўпік каля дзевяціпавярховіку, на самым рагу.

«Хуткая» стаяла фары ў фары зь міліцэйскім «казлом». Мы пад'ехалі ўшчыльную, ледзь не задушыўшы нейкага хлапчука з сабакам. Прыхапіўшы сумку зь мікрафонам, я сунуўся ў натоўп.

— Добры дзень. Мы з абласнога тэлебачаньня.

Старшы лейтэнант стаяў моўчкі, разглядаючы трэснутае лабавое шкло «мэрса» і тапак на капоце. На маё прывітаньне нетаропка азірнуўся, кіўнуў. Разгублена падціснутыя вусны. За маёй сьпінай Міша ўладкоўваў камэру. Я дастаў шнур і мікрафон.

— Можна задаць вам пару пытаньняў?

Гэтак жа нетаропка ён адвярнуўся, затым мякка пахістаў галавой.

— Не.

— Чаму? — я паспрабаваў зазірнуць яму ў вочы.

— Я сказаў, не.

Міша тым часам здымаў машыну. Сярод пырскаў шкла — пасма валасоў і пляміна крыві. Правалены дах. Цела ўжо не было. Кроў на сьнезе — паказаў я Мішу, і ён апусьціў камэру.

— Цікава, чаму яна скокнула ў тапках? — прамармытаў Міша.

— Замерзла дома, — ціха адгукнуўся міліцыянт.

Я азірнуў натоўп. Малеча, дзьве бабулі, жанчына зь дзіцём на руках — нават не адварочвала яму твар. Сапраўды, няхай глядзіць, чаго там. Яна стаяла роўна і ўпэўнена, нават з выклікам, плюючы пад ногі і крыху ўбок шкарлупіньне ад семак.

— Скажыце, — я падышоў, яна апусьціла дзіця. — Хто была гэтая жанчына?

— Мая суседка.

— Можна я задам вам некалькі пытаньняў на камэру?

— Не, — дзіцё пачало сядаць на сьнег, яна падхапіла яго зноў на рукі.

— Як яе звалі хоць? — я азірнуўся.

Малыя і бабулькі чамусьці адышлі ад нас і паказвалі сваім відам, што здымацца ня будуць.

— Наташа.

— Гэта яе акно? — я паказаў уверх.

Дзіўнае пытаньне. Акно на чацьвертым паверсе адно было расхінутае, вонкі боўталася фіранка.

— Так, — жанчына таксама паглядзела ўверх. — Вы пойдзеце туды?

— А куды яшчэ нам хадзіць?! Вы ж ніхто ня хочаце нам нічога гаварыць.

У пад'езьдзе мы сутыкнуліся зь дзьвюма заплаканымі жанчынамі. Пабачыўшы камэру, яны непрыемна, нібыта з асуджэньнем паглядзелі на мяне.

Ліфт не працаваў, я дапамог Мішу несьці штатыў.

Перад дзьвярыма ў кватэру я нечакана разгубіўся — нібыта недзе ў галаве заматлялася запозьненае рэха позіркаў тых жанчын. Што я скажу? У вас тут жанчына выкінулася? Можна ўзяць у вас інтэрвію? Вы яе мама? Што вы можаце сказаць нашым тэлегледачам? Дзякуй, глядзіце вячэрнія навіны, у восем гадзін.

— Пайшлі назад, — я вінавата паглядзеў на Мішу. — Ня трэ было сюды йсьці.

На паўпралёту ніжэй нам спаткалася тая самая жанчына зь дзіцём.

— Паслухайце, — яна відавочна сьпяшалася спэцыяльна за намі. — Я вам магу што-небудзь расказаць. Толькі вы пакуль не запісвайце, я проста так.

— Слухаем, — я дастаў блякнот.

— Яна Наташа Скварцова, я зь ёй у адну клясу хадзіла. Разьведзеная.

— Вы?

— Яна. Я не была замужам. Яна выкінулася дзеля хлопца. Са школы яго кахала. Сяргей.

Наверсе рыпнулі дзьверы. З кватэры Наташы Скварцовай выйшлі некалькі чалавек. Пачуўся прыглушаны і немы лямант.

— А вас як завуць?

— Таня.

— Можа, мы спусьцімся ніжэй? Тут вашага сына прадзьме, — праз зіхоткае акно заўважна цягнула.

— Не прадзьме, — яна перакінула хлопчыка з рукі на руку. — Гэта я тэлефанавала на вашу студыю і выклікала вас.

Апошняе яна сказала ціха, бо набліжаліся людзі. Гэта былі дзьве іншыя заплаканыя жанчыны.

— Наташа кахала хлопца, а ён пасьля войска яе кінуў. Яна яго паўтара году чакала, а ён, калі вярнуўся, некалькі разоў зь ёй пераспаў і кінуў, паехаў у Германію. Яна зь небагатай сям'і…

Нечакана хутка стаміўшыся стаяць, я абапёрся на парэнчы. Міша на ўсялякі выпадак рыхтаваў камэру. Жанчына не пярэчыла.

— Яна выйшла замуж, — працягвала Таня, зноўку перакінуўшы дзіця. — І раптам Сяргей ізноў вярнуўся. Трохі зарабіў грошай. І яна зноў стала зь ім спаць. Яе мужу пра гэта сказалі, ён хацеў забіць Сяргея, але Наташа яго выгнала з дому і падала на развод.

— Ну, — я кіўнуў.

— А Сяргей ізноў яе кінуў.

— Цікава, — абыякава зазначыў Міша.

— У яго тут яшчэ жанчыны былі.

— Гэта дакладна? — каб не стаяць проста так, я пачаў маляваць у сваім блякноце палачкі.

— Ну што я, ня ведаю?

— І што ж?

— Чаму яна кінулася, вы хочаце знаць? Ён учора прыехаў. Сяргей. У яго новы «мэрсэдэс». І жонка.

— Бывае.

— І Наташа кінулася на гэты «мэрсэдэс», ясна?

— Ясна.

— Яна выскачыла спэцыяльна, каб разьбіцца на іхнай новай машыне. Ясна? — яна расчырванелася і крычала крыкам. — Вось чаму я пазваніла вам у рэдакцыю!

— А чаму вы там, унізе, адмовіліся гаварыць?

— Таму што там быў ён.

— Сяргей?

— Наташын першы муж, — яна ткнула пальцам уніз. — Міліцыянт.

— Скажыце, — я схаваў блякнот, — вы апраўдваеце яе ўчынак?

— Уключы камэру! — крыкнула Тацяна Мішу.

Я кіўнуў.

— Уключыў? — зноў крыкнула яна.

— Уключыў.

—Так, я апраўдваю! — яна перакінула дзіцёнка зноў. — Я сама кахала Сяргея, ясна? Здымаеш?

— Здымаю.

— Сука! — яна раптам зрабіла крок да нас зь Мішам. — Я хацела сказаць — мужыкі ўсе казлы. Яму гэтая баба «мэрсэдэс» купіла, ён яе замуж узяў. А мяне год трахаў.

— Ня ўсе мужыкі казлы, — сказаў я. Міша мяне падтрымаў.

— Усе! Сукі! — яна плюнула Мішу ў твар.

— Э-э! — крыкнуў я, якраз перад тым, як яе калена ўвайшло мне пад куртку.

— А-а-а! — закрычала яна.

Шкло лёгка лопнула пад яе важкім целам.

— Дурніца! — я курчыўся на прыступках, калі ў правале мільгануў яе фарбаваны хвост.

Нейкім дзівам ёй удалося таксама патрапіць у «мэрсэдэс». Калі мы спусьціліся, натоўп крыху вырас. Міліцыянт стаяў на тым самым месцы, толькі цяпер зьдзіўлена прыўзьняўшы бровы.

Насупраць яго, з другога боку машыны, пад капелюшом пачэсваў галаву высокі цёмнавалосы мужык з арлінымі носам і зарослым падбародзьдзем.

— Ты Сяргей? — спытаў я яго.

— Ну.

— Машыну застрахаваў?

— Не пасьпеў.

— М-да, — я пахітаў галавой. — Як думаеш, сёньня яшчэ хто-небудзь кінецца, ці нам ужо можна ехаць?

Сяргей пацісьнуў плячыма.

— М-да, — я зноў пахітаў галавой.

— Бабы дурныя, — прамармытаў за сьпінай Сяргей і плюнуў.

Шыракакрылымі шматамі ў паветры плыў нетаропкі сьнег.

● ТЫДЗЕНЬ У АСОБАХ ●

Аканкагуа стала явай

Альпіністка Ірына Велянкова выпраўляецца на Аканкагуа. Сваёй марай скарыць найвышэйшы пік Паўднёвае Амэрыкі (6960 м) яна дзялілася з чытачамі «НН» яшчэ ў ліпені 2001-га, але арганізаваць экспэдыцыю ўдалося толькі сёлета. Грашыма й квіткамі нечакана ўзялося дапамагчы беларускае пасольства ў Аргентыне. Кожнае ўзыходжаньне для менскай бухгальтаркі й майстра спорту міжнароднай клясы — подзьвіг: пасьля абмаражэньня на Даўлагіры ў Тыбэце Ірыне ампутавалі пальцы ног і часткі ступакоў. А ўсяго праз некалькі гадоў яна ўсталявала бел-чырвона-белы сьцяг на гары Мак-Кінлі, найвышэйшым пункце Паўночнай Амэрыкі. Аканкагуа чакае.

Кава-Рэната

Шалёна папулярны ў Літве напой — «кава-Рэната». Яе масава замаўляюць у віленскіх кавярнях. Дзіва што: імя Рэнаты Смайлітэ апошнія месяцы празь дзень мільгала ў прэсе побач зь імем Раландаса Паксаса. Менавіта ў кватэры Смайлітэ людзі Паксаса сустракаліся зь літоўскімі й расейскімі мафіёзі. Гаспадыня частавала гасьцей кавай з брэндзі. Спн.Рэната мае паніжаны ціск, а гэты напой якраз уздымае тонус. Калі выбухнуў «Паксасгейт», кава з брэндзі зрабіла ў Літве фурор. Смайлітэ нават запатэнтавала «каву-Рэнату», а таксама сваё імя і прозьвішча. Гэтак рабіла Моніка Лявінскі пасьля скандалу з Клінтанам. Як і Моніка, Рэната зьбіраецца напісаць кнігу пра свой удзел у скандале. На гэтым супадзеньні сканчаюцца.

Дэмакраты стартавалі

Джон Керы, 60-гадовы вэтэран Віетнаму, сэнатар і былы пракурор, набраў 37,7% галасоў на першых «праймэрыз» Дэмакратычнае партыі. Фэрмэрам штату Аёва Керы з простым лёзунгам «Аёва, я цябе люблю» спадабаўся больш за Говарда Дына — фаварыта Альбэрта Гора. На сходах партыйных актывістаў няма ні скрыняў, ні бюлетэняў. Колькасьць прыхільнікаў таго ці іншага кандыдата падлічваюць «па галовах» — накрываючы даланёй макаўку кожнага.

Такая перамога ня значыць, што на восеньскіх выбарах прэзыдэнта ЗША дэмакрат Керы будзе супрацьстаяць рэспубліканцу Бушу. У свой час Рэйган і Клінтан таксама прайгравалі ў Аёве. Тым больш што на наступным сходзе, 27 студзеня, у Нью-Гемпшыры да гонкі далучацца кандыдаты цяжкай вагавой катэгорыі — сэнатар Джозэф Лібэрман і генэрал Уэслі Кларк. Апошні на пытаньне, як яны будуць змагацца з Керы, адказаў: «Дык Керы ж — лейтэнант, а я — генэрал».

СМ

А ўжо па Вадохрышчы!

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Трашчы не трашчы, а ўжо па Вадохрышчы!» Гэтая прымаўка не пра вераб'ёў, натуральна, а пра мароз. І пра ўсё тое нядобрае, чым мучыла зіма. Хутка вясна!

А ногі цягнуцца дамоў

гумарыстыка

Вясёлы дзядзька з артыстычнымі здольнасьцямі, кульнуўшы чарку, цэлую гадзіну забаўляе прысутных. Чытае гумарыстычныя вершы, сьпявае. Вычарпаўшы рэпэртуар, са скрухаю гаворыць:

— Я ў раёне на конкурсе самадзейнасьці другое месца заняў. А на вобласьці мне мікрафон далі, дык не заняў нічога. Журы напроціў мяне запісала: громка крычаў.

* * *

— Вось у суседкі маёй мужык харошы. Ня п'е, сям'ю глядзіць, на дачу езьдзіць. А мой толькі паддаваць і ўмее!

— Затое як пампэ, дык хоць ня жалка!

* * *

— Ці памагаюць табе дзеці?

— Дзіва што памагаюць! Як кабана заб'ю.

* * *

«Душа баліць за праізвоства, а ногі цягнуцца дамоў».

* * *

Маладая маці зь дзіцём едзе ў тралейбусе. Малое голасна румзае. Сталы дзядзька побач угаворвае:

— Як будзеш плакаць, бацька на Лаўсане рабіць будзе, а як сьціхнеш, дык у багатай фірме.

Дзіця нечакана змаўкае.

— Знаець, — сьмяецца маці. — Баба нашая на Лаўсане работаець!

* * *

«Узрослага чалавека ужо не васьпітаеш. Толькі забіць можна».

Бацькаў гонар

— Чатыры сыны ў мяне. Адзін у Менску, другі ў Маскве, трэці ў Магілёве, чацьверты — у Асіповічах. Усе павывучваліся! Дзякуй Богу, ні адзін тут не застаўся!

* * *

— Варушышся, торбы цягаеш, усё етым бабам трэба. Было б чатыры рукі, яшчэ б дзьве торбы ўзяла!

— Некаторым жа нічога ня трэба. Сядзяць дзень на лаўцы!

— А як паглядзіш — жывем адзінакава.

* * *

— Што ты лаешся! Да сівых валасоў дажыў, а розуму не нажыў.

— Ёсьць у мяне розум!

— Можа й быў, ды ўвесь з гарэлкаю выцек!

* * *

Перапоўнены аўтобус падыходзіць да Лекерты — вёскі, спрадвеку населенай рускімі старaверамі. Да гораду застаецца ня болей як два-тры кілямэтры. На прыпынку стаіць мужчына й галасуе. Раптам адзін дзядзечка з добразычлівым тварам голасна кажа:

— Пяшуком дойдзеш, кацап ты!

Аўтобус едзе далей не спыняючыся.

* * *

«Дземакраціі ім мала? Бяры лапату ды капай!»

* * *

— Цяпер учыцеля эці дзяцей учыць ня хочуць саўсім. Каранцін прыдумалі. А мне дзе столькі яды набрацца? Сядзяць дзеці дома й цэлы дзень точаць!

* * *

Праходзьце далей, я да сама заду еду.



АНДРЭЙ ТАКІНДАНГ

Запісвала Тацяна Барысік

у аўтобусах Бабруйск—Глуск, Магілёў—Шклоў, Бабруйск—с-з Леніна, Бабруйск—Бялынічы, магілёўскім гарадзкім транспарце, дызэль-цягніку Магілёў—Асіповічы. Асаблівасьці простай мовы захаваныя.

Людка Сільнова

Любімы Вецер

Яго завуць Вецер.
Ён зь вёскі Сем Арлоў
І першы на савеце
Абуджаных вятроў.

Люблю яго далоні,
І позірк, нібы лёд,
Сівыя гурбы — скроні,
І мэту навылёт!

Калі на ноч кладуся
Ў халодную пасьцель,
Мяне цалуе ў вусны
І кідае камель

Зямлі... Бо мне на сьвеце
Ён першы між вятроў!
Яго завуць Вецер.
Ён зь вёскі Сем Арлоў.

15 студзеня 2004

● НОВЫЯ КНІГІ ●

Астапенка А. Нацыянальная ідэя ў сучасным сьвеце. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 184 с. 200 ас.

Аўтар манаграфіі абгрунтоўвае думку, што нацыянальная ідэя — гэта праект, з дапамогай якога нацыя рэалізуе сябе ў сьвеце. У «Цэнтральнай кнігарні» выданьне каштуе 8270 руб.

Карніловіч Э. Імёны зь небыцьця. — Менск: Беларусь, 2003. — 315 с.: іл. 2000 ас.

Сярод герояў гэтае дакумэнтальна-біяграфічнае кнігі — і вядомыя дзеячы нацыянальнай гісторыі, і шараговыя беларусы. Іхныя лёсы паяднаныя супольнай трагедыяй: чужынскія ўлады вынесьлі кожнаму беспадстаўны сьмяротны прысуд.

Крывіцкія руны: Беларускія пісьменьнікі Латвіі / Укл. і прадм. С.Панізьніка. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 340 с. 500 ас.

Анталёгія знаёміць з творчасьцю беларусаў, народжаных за апошнія 80 гадоў на латгальскай зямлі. У «Акадэмкнізе» й «Цэнтральнай кнігарні» цана 5700 руб.

Пачынальнікі: З гіст.-літ. матэр. XIX ст. / Укл. Г.Кісялёва. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 549 с. 2500 ас.

Другое выданьне (першае — 1977 г.) вытрымлівае кніга, прысьвечаная пэрыяду станаўленьня новай беларускай літаратуры. Тут сабраныя разнастайныя дакумэнтальна-гістарычныя крыніцы (асобныя публікацыі, ліставаньне, запісы й г.д.), што даюць зьвесткі пра дзейнасьць В.Дуніна-Марцінкевіча, П.Багрыма, А.Гурыновіча, Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны ды іншых пачынальнікаў.

Сабалеўскі А. Кандрат Крапіва: Постаць і творы. — 2-е выд., дапр. і дап. — Менск: Народная асьвета, 2003. — 304 с.: іл. 2700 ас.

Сініла Г. Біблія як фэномэн культуры й літаратуры. Ч. 1. Духоўны й мастацкі сьвет Торы. Кніга Быцьця. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 451 с. 1500 ас.

Кніга Кнігаў разглядаецца комплексна — зь філялягічнага, філязофскага, культуралягічнага й рэлігіязнаўчага гледзішчаў. Гэтае прысьвечанае Пяцікніжжу Майсееву выданьне — першае з заплянаванае сэрыі.

Тацяна Вабішчэвіч

● ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ ●

ВІТАНЬНІ

26 студзеня — 440-годзьдзе бітвы пад Улай. Віншуем усіх беларусаў зь перамогай (у т. л. Міхася Шыпулю і Алеся Пазьняка). Сябры

КАНТАКТЫ

Мянчук (42/170/54) з в/а, бяз шк/зв, пазнаёміцца з жанчынай. Магчыма стварэньне сям'і. А/с 6, 220012, Менск

Прадам мэблю. Нядорага. Т.: 244-13-70

Высокаадукаваны, добрага дастатку, самастойны малады хлопец пазнаёміцца зь дзяўчынай добрых паводзін для стварэньня сям'і. Т. (у Пружанах): 2-39-64. Дзіма

Аўтару(цы) Цыфырблы. Слушна. Крыся

КНІГІ, МУЗЫКА

Кнігі — поштай. Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050 Менск; e-mail: exlibris@tut.by, Internet: http://www.knihi.net. Т.: 8-029-643-57-33

Кнігі — поштай. Новыя: «ARCHE-Пачатак» №5/2003 («Віленская анталёгія»), «Дзеяслоў» №6/2003, Круталевіч В., Юхо І. «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917—1945 гг.)», «Спадчына» №5-6/2002, Герлінг-Грудзіньскі Г. «Наш брат — Зло». Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

Кнігі — поштай. Новыя CD: «Сьвяты Вечар» (2-е выданьне), «Narodny Albom» (перавыданьне), «Легенды Вялікага Княства», Стары Ольса «Келіх Кола». Т.: 8-029-643-57-33

Францішка Ўршуля Радзівіл. 26-я кніга сэрыі «Беларускага кнігазбору». Самае поўнае ў сьвеце выданьне твораў пісьменьніцы. 448 старонак

«Крывіцкія руны. Беларускія пісьменнікі Латвіі». Новая кніга «Беларускага кнігазбору». 340 старонак з блёкамі ілюстрацыяў. 19 аўтараў. К.Езавітаў, В.Вальтэр, В.Ластоўскі, П.Мядзёлка, С.Сахараў ды іншыя

ПРАЦА

Якасна выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Т.: 235-18-71 (пасьля 16.00). Юрась

Праца для Вас. Рэальны заробак. Магчымасьць кар'еры. Т.: 8-029-766-12-79. Зьмітрусь

Абвяшчаецца конкурс на замяшчэньне вакантнай пасады **дырэктара Нацыянальнага навукова-асьветніцкага цэнтру імя Ф.Скарыны.**

Патрабаваньні: навуковая ступень, дасканалае валоданьне беларускай мовай, адной з замежных моваў, кампутарам, ініцыятыўнасьць, здольнасьць працаваць у напружаным рытме, адказнасьць і аналітычнасьць мысленьня.

Т.: 206-57-97, 220-93-50

Запрашаем

на падарожжа 25 студзеня (нядзеля) па маршруце: Менск — Ішкалдзь — Вольна — Паланечка — Завосьсе — Сталовічы — Новая Мыш — Баранавічы — Крошын — Менск.

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)

Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

«Наша Ніва» дзякуе за падтрымку спадарыні Моніцы Банькоўскай-Цюліг (Цюрых)

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3430. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 21.01.2004.
Замова № 386.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а